№ 37 – 38 (810 – 811)
Кастрычнік 2020 года

# Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года
kazeta.by bfk.by

## У нумары:


- Асоба: *журналіст, краязнаўца, кінарэжысёр А. Шнэйдар* – ***стар. 3***
- Даклады: *шарсцінская крынічка і магія прыдзвінцаў* – ***стар. 4 і 5***
- Царкоўнае краязнаўства: *драўляны храм у Дудах, мучанік А. Ляшчэвіч* – ***стар. 6 і 10***
- Лёс: *Ю. Тарасюк і нацыянальна-вызваленчы рух Заходняй Беларусі* – ***стар. 8***


**У Глыбокім прайшла навукова-практычная канферэнцыя «Беларусь, Глыбоцкі край і Эдвард Вайніловіч»**



*Пра яе распавядзем у наступным нумары*

***Беларускі фонд культуры і «Краязнаўчая газета» шчыра віншуюць усіх работнікаў культуры Беларусі з прафесійным святам – Днём работнікаў культуры!***

У гэты дзень наша грамадства ўшаноўвае артыстаў, музыкаў, кіраўнікоў творчых калектываў, работнікаў музеяў, бібліятэк, клубных установаў, школ мастацтваў – усіх тых, хто рупліва працуе на ніве культуры, захоўвае гісторыка-культурную спадчыну, зберагае і развівае народныя традыцыі, далучае нашых суграмадзянаў да найлепшых узораў сусветнага мастацтва, дорыць добры настрой і стварае камфортны лад жыцця.

Беларуская культура сёння – гэта і вынік плённай руплівай і бескарыслівай працы многіх пакаленняў, а таму самыя шчырыя віншаванні мы накіроўваем нашым ветэранам – былым міністрам і намеснікам міністраў, начальнікам упраўленняў і аддзелаў культуры, кіраўнікам метадычных цэнтраў, усім тым, хто на працягу многіх гадоў фармаваў культурную палітыку і ўносіў свой асабісты нефармальны ўклад у яе рэалізацыю.

Краязнаўцы і даследчыкі мясцовай гісторыі таксама ўзбагачаюць культурную палітру краіны і сваёй малой радзімы, спрыяюць захаванню гістарычнай памяці і духоўнага кода нашай нацыі.

Прыміце словы ўдзячнасці за ваш талент і майстэрства, няспынную творчасць і шчырую адданасць прафесіі.

***Жадаем новых творчых перамог, натхнення, моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту!***

# Ехала кніга на веласіпедзе

Навагрудская раённая бібліятэка ў рамках тыдня Еўрапейскай мабільнасці зладзіла шэраг цікавых мерапрыемстваў. Цягам некалькіх дзён, калі дазваляла надвор’е, каля будынка бібліятэкі аддзел абслугоўвання і інфармацыі арганізоўваў інтэрактыўную пляцоўку «Рух наперад. Маршруты беларускай мабільнасці». Кніжна-ілюстрацыйная выстава знаёміла з «зялёнымі» відамі транспарту, бібліятэкары расказвалі, што мабільнасць – гэта не толькі транспарт, але і камфортнасць жыцця ў горадзе для ўсіх людзей. З дапамогаю настольнай гульні можна было пазнаёміцца з цікавымі гістарычнымі мясцінамі Беларусі, даведацца пра іх месцазнаходжанне. Гараджане прызнаваліся, што пра многія з іх яны пачулі ўпершыню. Цягам тыдня ў Навагрудскай раённай бібліятэцы прайшлі анлайн- і вочныя віктарыны, кніжныя выставы і літаратурныя агляды, але самым запамінальным атрымаўся інтэлектуальны веламаршрут «Кніга на веласіпедзе». Веласіпед, як вядома, самы экалагічны, а таксама хуткі транспарт, да таго ж многія чытачы выбіраюць для сябе менавіта гэты від транспарту.

У якасці партнёрскай падтрымкі турысцка-інфармацыйны цэнтр Навагрудка і ўпраўленне спорту і турызму Навагрудскага райвыканкама прадаставілі бібліятэцы веласіпеды і інфармацыйныя буклеты са звесткамі пра веламаршруты раёна, гісторыка-культурныя славутасці і музеі горада. У заплечніках веласіпедыстаў былі цікавыя кнігі і невялікія падарункі. Маршрут пралягаў праз гістарычны цэнтр горада па навагрудскіх пагорках да новага мікрараёна.

Адным з першых прыпынкаў маршруту стала пляцоўка каля Навагрудскага раённага цэнтра рамёстваў, дзе сабраліся мясцовыя жыхары мікрараёна. Бібліятэкары задавалі гараджанам літаратурныя пытанні, запрашалі наведаць бібліятэкі горада, расказвалі пра экалагічныя віды транспарту, дарылі кнігі, буклеты і ўлёткі пра культурныя славутасці Навагрудка. Удзельнікаў веламаршруту віталі ўсмешкамі, віншавалі з Днём бібліятэк, што прайшоў напярэдадні. І дарослыя, і дзеці былі радыя атрымаць у падарунак кнігу.

Канчатковым прыпынкам веламаршруту стаў фізкультурна-аздараўленчы комплекс «Лідар», дзе сёлета пачаў працаваць бібліятэчны пункт Навагрудскай раённай бібліятэкі. Там была зладжаная інтэрактыўная пляцоўка з кнігамі і часопісамі спартыўнай тэматыкі, можна было выбраць раман або дэтэктыў. Дзеці з задавальненнем удзельнічалі ў віктарыне, а за правільныя адказы атрымлівалі падарункі. Прыемна адзначыць, што многія дзеці і дарослыя выказалі жаданне стаць чытачамі новага бібліятэчнага пункта, ды і наогул наведаць бібліятэкі горада.

*Святлана ЧУБРЫК,*
*загадчык аддзела*
*абслугоўвання і інфармацыі*
*Навагрудскай раённай бібліятэкі*



## Падпіска 2020 → Падпіска 2021

У нядаўніх нумарах «Краязнаўчай газеты» мы звярталіся да чытачоў і падпісчыкаў з просьбаю адгукнуцца і выказацца пра неабходнасць працягу выдання газеты ў наступным годзе, а таксама выказацца пра яе плюсы і хібы. Сёння пачынаем новую рубрыку, дзе будзем знаёміць з атрыманымі водгукамі сяброў. Такім чынам, мы не закрываем апытанне, чакаем новыя пісьмы.

І дадаем: **«Краязнаўчая газета» ўнесеная ў падпісны каталог «Белпошты» на першае паўгоддзе 2021 года**. Таму – звяртайцеся на пошту і выпісвайце газету!

**Мікола Шуканаў, г. Жлобін:**
*Збіраюся зрабіць 2 падпіскі на 2021 год.*

**Шчучынская раённая бібліятэка:**
*ДУК «Шчучынская раённая бібліятэка імя Цёткі» ў 2021 годзе плануе афармляць падпіску на 6 асобнікаў «Краязнаўчай газеты».*
*Для падпіскі больш зручны папяровы фармат газеты, таму што большасць чытачоў – жыхары сельскай мясцовасці (5 з 6-і асобнікаў).*

**Ала Майсяёнак, г. Дзісна:**
*1. Падпісвацца на 2021 г. ПЛАНУЮ.*
*2. Сагітаваць на падпіску знаёмых, хутчэй за ўсё, НЕ змагу.*
*3. Фармат для мяне лепш ПАПЯРОВЫ.*
*4. Што прапаную і што мне падабаецца:*
*знаёмствы з краязнаўцамі, музеямі;*
*успаміны людзей, як жылося раней – пра лёс, падзеі мінулага;*
*абмеркаванне складаных, спрэчных пытанняў гісторыі і станаўлення нац. свядомасці (розныя думкі).*
*5. Аддзел пісьмаў (меркаванні людзей, думкі аб лёсе краіны).*
*Пытанне: ну вось чаму кожная частка разнадумцаў так агалцела даказваюць сваю прыватную «праўду», зневажаючы апанента, даходзячы да варожасці??? Чаму адключаецца розум??? Чаму няма аналітычнага непрадвзятого мнения??? ЧаМу? ЧАму? Чаму?*
*А таму, што аслабла духоўнасць, г.зн. пачуццё божай еднасці. Таму што галоўнымі сталі карысныя матэрыяльныя каштоўнасці, якія родзяць чэрствасць і раўнадушша. Таму што няма работы па духоўным выхаванні і духоўнай адукацыі асобнага чалавека (ён даўно не ведае, што ёсць «добра», а што – «дрэнна», і як гэтае «дрэнна» скажацца на яго лёсе і на лёсе яго дзяцей).*
*ТОЛЬКІ з вяртаннем подлинной духоўнасці матэрыяльнае жыццё і справядлівасць у грамадстве наладзіцца. Усё, здавалася б, проста. Але як гэта зрабіць???*

**Клічаўскі краязнаўчы музей:**
*Добры дзень, калегі!*
*Тэрмінова адказваем на вашы пытанні наконт далейшага лёсу «Краязнаўчай».*
*Клічаўскі краязнаўчы музей аформіў падпіску на вашу газету да канца 2020 года, таму мы з вамі будзем да канца года, гэта дакладна.*
*У сувязі з цяжкім фінансавым становішчам наўрад мы зможам загітаваць выпісваць нейкую арганізацыю, але пару-тройку чалавек паспрабуем.*
*Больш зручны электронны, для раздрукоўкі і працы з тэкстамі, раім рабіць pdf-версію дадаткам да друкаванай і вывешваць на сайце альбо рассылкай падпісантам на скрыню.*
*Для ўдасканалення зместу «Краязнаўчай газеты» раім дадаваць рубрыку кшталту «Весткі з бібліятэк... Брэстчыны/Магілёўшчыны/Міншчыны»,*
*хацелася б бачыць больш публікацый пра жыццё музеяў, такіх жа раённых, як і мы, хто чым жыве.*
*Усяго вам найлепшага, здароўя і неўміручасці вашай працы.*
*Калектыў Клічаўскага краязнаўчага музея.*

## На тым тыдні...

### Ратуемся спадчынай

✓ **«Чыстае імя маёй Радзімы – Беларусь!»** – назва кніжнай выставы, што дзейнічае ў абанементнай зале Бераставіцкай раённай бібліятэкі імя В. Кавалеўскага. Сярод дастаткова багатага фонду краязнаўчай літаратуры бібліятэкары аддзела абслугоўвання і інфармацыі пастараліся выбраць найбольш значныя, цікавыя і новыя выданні, што знаёмяць са знакавымі гістарычнымі, сацыяльна-эканамічнымі і культурнымі падзеямі на шляху развіцця і станаўлення нашай краіны як суверэннай дзяржавы.

Першы раздзел «Шляхамі роднай Беларусі» прадстаўляе творы па беларускай гісторыі ад старажытных часоў і перыяду Вялікага Княства Літоўскага да гадоў фашысцкай акупацыі і сучаснага развіцця дзяржавы, у другім раздзеле «Людзі зямлі беларускай» змешчаныя кнігі аб славутых суайчынніках, раздзел «Скарбы нашай прыроды» знаёміць з унікальнымі энцыклапедычнымі выданнямі і фотаальбомамі аб прыродзе роднага краю і запаведніках. «Куфар жыцця беларусаў» – чацвёрты раздзел – прысвечаны этнаграфічнай спадчыне. Экспануюцца таксама найноўшыя выданні аб сучасным становішчы краіны і яе дасягненнях у розных галінах.

✓ **25 верасня** Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў запрасіў паглядзець выставу італьянскага мастака Міма дэ Феліча (прозвішча якога перакладаецца з італьянскай «шчаслівы») **«Альбэрабэла»** (арганізатары: дызайнер Алеся Фаменка і мастацтвазнаўца Яўген Шунейка).

Мастак усё жыццё правёў у надзвычайным горадзе Альбэрабэла, які ведаюць далёка за межамі Італіі, у першую чаргу, дзякуючы трулям, уключаным у 1996 г. у спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Трулі – гэта дамы з конусападобнымі дахамі, што будаваліся, пачынаючы з XVI ст., без цэменту і аніякага іншага змацавальнага раствору, якія можна было лёгка і хутка разбурыць, проста выцягнуўшы адзін адмысловы камень. А яшчэ: пад час сёлетняй пандэміі каранавіруса ў Італіі горад застаўся не закранутым гэтай хваробай.

✓ У Халопеніцкай школе Крупскага раёна цягам вясноваletняга перыяду вучні 7 – 10 класаў праводзілі **сортавыпрабавальны эксперымент па вырошчванні цыбулі з насення**, нядаўна ўдзельнікі падвялі першыя вынікі эксперыменту. Яны праводзілі феналагічныя назіранні за развіццём цыбулі чатырох галандскіх і двух беларускіх гатункаў.

Навучэнцы ўстанавілі, што расадны спосаб з’яўляецца больш эфектыўным пры вырошчванні цыбулі гатунку «Эксібішэн F1». Сярод гатункаў галандскай селекцыі ўраджайнымі аказаліся «Алонса F1» і «Мустанг F1». Гатункі цыбулі рэпчатай беларускай селекцыі «Ветразь» і «Скарб Літвінаў» саступілі па прадуктыўнасці галандскім. Маладыя даследчыкі пераканаліся, што цыбулю з насення эканамічна выгадней вырошчваць, бо кошт насення значна ніжэй, чым сеянкі. Яшчэ вучні і настаўнікі праводзяць «экспертызу» вырашчанага ўраджаю, каб даведацца, чым і ў якой ступені заражаныя цыбуліны, ці будзе заўчасна прарастаць пяро, цікавіць пытанне і працягласці захоўвання цыбулі.

✓ Пад час чарговай сустрэчы з цыкла **«Санаторый падклепсідрай»**, што ладзяць Польскі інстытут у Мінску і кнігарня «Логвінаў», перакладчыца і выкладчыца літаратуры Марына Шода **29 верасня** апавядала пра знакамітага польскага пісьменніка і педагога Януша Корчака. Сярод іншых тэмаў былі закранутыя: чым адрозніваецца беларускае выданне «Караля Мацюся» 2012 г. ад выдання 1970 г.? што рабіць з каралеўскай уладай, аб якой ты не прасіў? увогуле – як любіць дзяцей?

✓ **1 кастрычніка** ў Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў Рэспублікі Беларусь адбылося **афіцыйнае адкрыццё выставы, прысвечанай 5-годдзю Цэнтра**.

Гледачы пабачаць фатаграфіі былых экспазіцыяў, перададзеныя мастакамі ў фонды творы, плакаты, каталогі, тэксты. У экспазіцыі прадстаўленыя таксама буйныя міжнародныя праекты НЦСМ, рэалізаваныя пры падтрымцы пасольстваў Аўстрыі, Германіі, Латвіі, Літвы, Іспаніі, Польшчы, Фінляндыі, Францыі, Чэхіі, Швецыі і Японіі. Дэманструюцца малявідэмная карціны Міхаіла Савіцкага і фотаздымкі з часоў Творчых майстэрняў.

Выставачны праект можна ўбачыць у НЦСМ Рэспублікі Беларусь (на вул. Някрасава) да 15 лістапада.

✓ **2 кастрычніка** ў Чэрвеньскім раённым Цэнтры культуры і вольнага часу прайшло **свята «Дзень настаўніка»**: віншаванні, узнагароды, словы ўдзячнасці атрымлівалі лепшыя прадстаўнікі педагагічных калектываў раёна.

У фае выхаванцы Смілавіцкага Цэнтра дзяцей і моладзі імя Хаіма Суціна прадставілі цікавую пастаноўку. Павіншаваць педагогаў прыйшлі кіраўнікі раёна, прафсаюзнай арганізацыі, начальнікі ўпраўленняў і аддзелаў райвыканкама. Асаблівыя словы падзякі былі выказаныя ветэранам педагагічнай працы. На ўрачыстай цырымоніі прадэманстравалі відэаролік з віншаваннямі педагогаў ад розных установаў раёна.

У завяршэнні свята выступіў вакальна-інструментальны ансамбль «Новы дзень».

*Скарыстаная інфармацыя з сайтаў газет «Крупскі веснік», «Бераставіцкая газета», «Раённы веснік» (Чэрвень), паведамленняў Польскага інстытута ў Мінску, Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў Рэспублікі Беларусь*






«Дзень настаўніка»



## Перамога ў конкурсе «Праваслаўе – мая надзея!»

***10 – 12 верасня на Гомельшчыне прайшоў XV Міжнародны фестываль-свята «Славянскія літаратурныя дажынкі – 2020», які аб'яднаў пісьменнікаў і майстроў мастацтваў Беларусі, Расіі і Украіны.***

На адкрыцці мерапрыемства, у Гомелі, яго ўдзельнікаў цёпла віталі намеснік старшыні аблвыканкама Уладзімір Прывалаў і старшыня абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Уладзімір Гаўрыловіч. Лепшым паэтам і празаікам была ўручаная традыцыйная абласная літаратурная прэмія імя Кірылы Тураўскага, Архірэйскія граматы і медалі Гомельскай праваслаўнай епархіі – святога праведнага Іаана Кармянскага і прападобнай Манефы Гомельскай, дыпломы пераможцаў творчых конкурсаў. Пераможцам аднаго з такіх конкурсаў, «Праваслаўе – мая надзея!», які праводзіцца сумесна абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі і Гомельскай епархіяй, стаў пастаянны аўтар «Краязнаўчай газеты», сябра Царкоўна-гістарычнай камісіі Гомельскай епархіі, сябра Міжнароднага грамадскага аб'яднання саюза пісьменнікаў і майстроў мастацтваў Мікалай Шуканаў. Старшыня аддзела рэлігійнай адукацыі і катэхізацыі епархіі протаіерэй Арцемій Крывіцкі па дабраславенні архіепіскапа Гомельскага і Жлобінскага Стэфана ўручыў яму дыплом І ступені ў намінацыі «Публіцыстыка» (на здымку). Мікалай Васільевіч прадставіў на конкурс сваё даследаванне аб жыцці і служэнні протаіерэя Іллі Неўмяржыцкага (1894 – 1973). Варыянт гэтай працы быў апублікаваны ў «КГ» (№ 7, 2019 г.).

*Аляксандр ПАТАПАЎ*
*Фота Наталлі КАНОПЛІЧ*

**ГА «Беларускі фонд культуры» і «Краязнаўчая газета» шчыра віншуюць нашага паважанага аўтара Мікалая Шуканава з перамогай у конкурсе і жадаюць яму здароўя, моцы, плёну ў працы і асабістым жыцці.**

# Кафля і посуд на археалагічнай выставе ў Заслаўі

***У музейна-выставачным комплексе гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Заслаўе» была акрытая археалагічная выстава, прымеркаваная да Дня горада (дарэчы, Заслаўю сёлета 1035 гадоў). Завітаем на экспазіцыю разам.***

У фондах запаведніка ў разнастайных калекцыях захоўваюцца тысячы экспанатаў. Сярод іх ёсць тыя, што непасрэдна звязаныя з гісторыяй Заслаўя, апасродкавана звязаныя, а таксама датычныя агулам да гісторыі Беларусі і свету. Вядома, найбольш каштоўныя для нас першыя. Да іх, сярод іншага, адносяцца археалагічныя матэрыялы, сабраныя прафесійнымі археолагамі пад час раскопак у Заслаўі і перададзеныя ў фонды музея-запаведніка. Вялікую частку гэтых матэрыялаў складаюць керамічныя вырабы X – XVIII стагоддзяў – посуд і кафля. З посуду варта назваць кубачкі і талеркі, рынку (керамічная патэльня), выкананыя ў рознай тэхніцы і формах з выкарыстаннем ганчарнага круга.

Уражвае разнастайнасць кафлі: па тэхніцы вырабу, прызначэнні, па відах пакрыцця паверхні і выявах на ёй. Што да тэхнікі – ёсць кафля гаршковая і каробчатая. Гаршковая мае форму гаршчочка з пляскатым дном. Каробчатая – прастакутную або набліжаную да квадрата з акруглай румпай, з дапамогай якой кафля мацавалася да паверхні печы. Каробчатая кафля, акрамя таго, па відах пакрыцця паверхні падзяляецца на тэракотавую, манахромную і паліхромную. Першая не пакрываецца палівай, другая – мае паліву аднога колеру, а трэцяя – пакрытая палівай некалькіх колераў. Сярод выяваў на каробчатай кафлі, прадстаўленай на выставе, прысутнічаюць геральдычныя (з гербамі Яна Янавіча Глябовіча, Сапегаў і іншымі), раслінны арнамент, выявы вінаграду, салярныя знакі (сімвал сонца) і іншыя. Таксама, датычна разнавіднасцяў, каробчатую кафлю з выставы можна падзяліць на звычайную і гзымсавую (карнізную).

*Паводле электроннай газеты «Заслаўскія зборы», № 4, 2020 г.*




*Фрагмент з вітрынамі, запоўненымі кафляй і керамічным посудам*

*Асоба ў краязнаўстве*

# «Рабіў тое, што лічыў патрэбным»

13 кастрычніка 1930 г. у вёсцы Парэчча Талачынскага раёна нарадзіўся журналіст, краязнаўца, кінарэжысёр Анатоль Шнэйдар. Ён член Саюза журналістаў СССР (1991), член Беларускай асацыяцыі клубаў ЮНЕСКА.

Анатоль Антонавіч скончыў Азярэцкую сямігодку, Аршанскі тэхнікум чыгуначнага транспарту (1951), аддзяленне журналістыкі Мінскай вышэйшай партыйнай школы. Працаваў чыгуначнікам на Пермшчыне. З 1965 г. – кіраўнік кінастудыі «Летапіс» пры Талачынскім раённым Доме культуры.

А. Шнэйдару належыць больш за 300 публікацыяў у перыядычных выданнях Беларусі па краязнаўстве, гісторыі, мастацтве і літаратуры і прыкладна 100 кінавідэастужак. Ён напісаў і выдаў кнігі «Талачын: гісторыка-эканамічны нарыс» (1983), «Мая Талачыншчына: старонкі гісторыі» (2006), «Сінявокая Талачыншчына» (2009), «Зямля над Друццю і Абалянкай» (2015). Адзін з аўтараў кніг «Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Талачынскага раёна», «Друцк і Барысаў», зборніка літаратурных твораў «Зямное прыцягненне». З кінастужак варта назваць «Друць», «Старажытныя паркі», «Жыві, крыніца, жыві». Рэжысёр фільмаў «Маналог драматурга», «1000-годдзе Друцка», «Родны край» і кінатрылогіі «Боль мая – вёска» (увайшлі фільмы «Паміраючая вёска», «Кінутая вёска», «Вёска, якой няма»). На VIII Нацыянальным кінафестывалі трылогія ўдастоеная дыплома журы «За грамадзянскую пазіцыю, мужнасць і спачуванне», прыза «За лепшы фільм VIII кінафестывалю», а таксама дыплома і прыза аргкамітэта фестывалю «За творчы ўклад у рух кінааматарства ў Рэспубліцы Беларусь». Творца і краязнаўца прызнаецца: «Даражэй за ўсё для мяне тыя ўзнагароды, у якіх ацэненая праца, якую давялося правесці, здымаючы стужкі. Вельмі важная фармулёўка. Я вельмі шаную прэмію "За грамадзянскую мужнасць і прафесіяналізм". Мне вельмі прыемна, што разгледзелі маю працу».



У 2010 г. А. Шнэйдару прысвоенае званне «Ганаровы грамадзянін Талачынскага раёна».

Краязнавец зазначае, што змалку навучыўся шанаваць і любіць прыроду, згадвае, што ў Парэччы было шмат жыхароў, жылі дружна, весела. І са скрухаю дадае, што цяпер мясцовасць не пазнаць, крыўдна бачыць, што вёска памірае.

Па сканчэнні Аршанскага чыгуначнага тэхнікума адправіўся па размеркаванні на Урал, дзе працаваў пяць гадоў. Але ўвесь час цягнула на радзіму, не хапала талачынскага прастору. Працы па спецыяльнасці на радзіме не было, і А. Шнэйдэр прыйшоў у райкам кампартыі. Паколькі вельмі любіў фатаграфаваць, у аддзеле культуры райкама яму купілі фотаапарат, а потым маленькую кінакамеру. З часам кінааматар і пачаў здымаць стужкі.

Спецыяльна для яго зрабілі студыю, дзе адпрацаваў прыкладна сорак гадоў. Грошай за гэта ніхто не плаціў, працаваў для душы: здымаў фільмы, што распавядаюць пра прыроду, ветэранаў, традыцыі, прысвечаныя беларускім абрадам. Галоўнай жа тэмай быў летапіс раёна. Аўтар хацеў паказаць людзям прыгажосць талачынскай зямлі, расплюмачыць, што ўсё гэта трэба берагчы. «Наогул, пакуль я здымаў свае фільмы, – згадвае Анатоль Антонавіч, – ніхто мне не перашкаджаў, але і не дапамагаў ніхто. Я і рабіў тое, што лічыў патрэбным».

Талачынскі краязнаўца прадставіў Беларусь на 48-м Міжнародным кінафестывалі і 45-м кангрэсе УНІКА-86. У 1988 г. удзельнічаў у 16-м Сусветным фестывалі шырокаэкраннага кіно.

Са знятых больш за сто фільмаў аб Талачыншчыне аўтар вылучае «Родны край». Гэта паэтычная замалёўка аб роднай прыродзе. А яшчэ – кінатрыпціх аб вёсках, што паміраюць, які пачаў здымаць з гісторыі свайго Парэчча, потым пачаў ездзіць у іншыя…

Пра кінааматара і краязнаўца А. Шнэйдара рэжысёр Вольга Дашук стварыла поўнаметражны фільм «Кінааматар. Восеньскі сон», зняты на кінастудыі «Беларусьфільм».

Маючы паважны ўзрост, Анатоль Антонавіч працягвае адукацыйную дзейнасць, сустракаецца з моладдзю і землякамі. Так, у лютым 2017 г. пад час правядзення тыдня інфармацыі «Бібліятэка – тэрыторыя чытання» прайшла сустрэча вучняў з ганаровым грамадзянінам раёна, вядомым краязнаўцам, пісьменнікам А. Шнэйдарам. Школьнікі з цікавасцю слухалі аб незвычайных адкрыццях іх равеснікаў з розных куткоў планеты ў галіне навукі. Расказваў таксама пра вядомых навукоўцаў, ураджэнцаў Талачыншчыны, звесткі пра якіх сабраныя ім у кнізе «Земля над Друтью и Оболянкой».

*Падрыхтаваў Уладзімір ПУЧЫНСКІ*

***ГА «Беларускі фонд культуры» і рэдакцыя, рэдкалегія «Краязнаўчай газеты» выказваюць захапленне шматграннаю дзейнасцю Анатоля Антонавіча ШНЭЙДАРА – аднаго з найстарэйшых краязнаўцаў краіны. Няхай здароўе і магчымасці даюць Вам сілы працягваць спасцігаць і папулярызаваць спадчыну роднага рэгіёну, няхай знаходзяцца людзі, здольныя захаваць Вашу багатую кніжную, фатаграфічную і фільмавую калекцыю для наступнікаў.***

# Крыніца маёй малой Радзімы[1]

*Даклад Аляксандры Карнавушанка, вучаніцы 9 «Б» класа СШ № 19 г. Гомеля*
*Кіраўнік Святлана Булавінская*

### Уводзіны

Мы жывем і вучымся ў цудоўным беларускім горадзе Гомель, на беразе не менш прыгожай ракі Сож. Яшчэ ад нашых бабуляў і дзядуляў мы даведаліся, што ваду з ракі ў недалёкім ад нас мінулым можна было піць без усялякіх ачышчальных збудаванняў. Нядаўна ў нас узнікла жаданне пабываць у такіх месцах, дзе людзі могуць выкарыстоўваць ваду, што выцякае з глыбіняў нашай зямлі, – з крынічак. Адна з такіх крыніцаў знаходзіцца недалёка ад Гомеля – у вёсцы Шарсцін Веткаўскага раёна.

**Мэтай** працы з'яўляецца выхаванне ў дзяцей школьнага ўзросту любові да малой Радзімы, усвядомленай неабходнасці захавання крыніцаў, развіцця даследчых навыкаў.



*Крыніца ў вёсцы Шарсцін*

### Малая радзіма і крыніца

Што ж такое крыніца? Сама родная зямля дорыць людзям свежасць, бадзёрасць, здароўе. Ваду з крыніцаў шанавалі, берaглі, будавалі для крыніцаў калодзежы, часта ачышчалі. А чалавек, які праходзіў побач, мог напіцца сцюдзёнай вадзіцы з каўша, пакінутага каля крынічкі.

У даўнія часы існавала павер'е, што чалавек, напіўшыся вады з крыніцы, здольны зачэрпнуць моц самой зямлі. Вада з крынічкі даходзіць да нас у сваёй адвечнай прыроднай форме, яна жывая.

З крынічкамі звязаны многія легенды і звычаі мясцовага насельніцтва. Ваду некаторых мясцовыя жыхары лічаць святой, лекавай, яе выкарыстоўваюць пры лячэнні розных захворванняў. На некаторых крыніцах збудаваныя капліцы, што маюць гістарычную і культурную каштоўнасць.

### Гісторыя крынічкі ў вёсцы Шарсцін

Аграгарадок Шарсцін знаходзіцца за 25 кіламетраў ад Гомеля. Вёска Шарсцін па пісьмовых крыніцах вядомая з XV стагоддзя як сяло ў Рэчыцкім павеце Мінскага ваяводства Вялікага Княства Літоўскага. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772 год) вёска ўвашла ў склад Расійскай імперыі. У 1897 годзе мястэчка Шарсцін адносілася да Гомельскага павета Магілёўскай губерні. Тут знаходзілася царква Нараджэння Святой Багародзіцы, былі школа, прыстань, цагельны завод, 6 крамаў, карчма, народнае вучылішча, хлебазапасны магазін, 2 ветракі, крупадрабілка, 3 кузні, а ў фальварку – вятрак, кузня.

Сёння гэта ціхая і ўтульная вёска. Адразу за ёй знаходзіцца крынічка са святой і лекавай вадой. Яе гісторыю нам распавёў айцец Андрэй Булацкі, настаяцель царквы Святога Мікалая Цудатворца (вёска Данілавічы, што знаходзіцца непадалёк Шарсціна).

Былая Шарсцінская царква вядомая тым, што ў 1870-х гадах тут пачынаў сваю службу малады святар Іван Іванавіч Гашкевіч, цяпер праслаўлены ў ліку святых праведны Іаан Кармянскі. Храм знаходзіўся ў пачатку вёскі на правым беразе ракі Сож. На месцы разбуранай царквы цяпер невялікі ліпавы парк, у якім мясцовыя жыхары паставілі паклонны крыж.

Непадалёк Шарсцінскай царквы знаходзіцца крыніца святой вялікамучаніцы Параскевы Пятніцы. Паводле падання, на дрэве каля крыніцы ў даўнія часы людзі знайшлі выяву святой. Знаходку ўрачыста перанеслі ў царкву, але абраз ранкам наступнага дня апынуўся на дрэве каля крынічкі. Другі раз перанеслі абраз у царкву, аднак ён зноў загадкава вяртаўся да крыніцы. Гэта паўтарылася і трэці раз. Пасля здарэння каля крыніцы пабудавалі капліцу і размясцілі там абраз святой.

Прабыла капліца на крыніцы да 1935 – 1936 гадоў, а затым яе разабралі і перавезлі туды, дзе быў конезавод, і ў ёй пабудавалі хлебную краму. Пад час нямецкай акупацыі ў Шарсціне праходзіла лінія фронту, і жыхароў 21 верасня 1943 года эвакуявалі, а калі яны вярнуліся, то многіх дамоў і хлебнай крамы ўжо не было, магчыма, іх немцы разабралі для збудавання бліндажоў. У 1947 годзе ў вёсцы засталося толькі 8 дамоў, астатнія былі спаленыя.

Цудадзейная выява святой вялікамучаніцы Параскевы Пятніцы захоўвалася ў капліцы да яе закрыцця ў 1935 – 1936 гадах, далейшы лёс абраза невядомы.

Цяпер у Шарсціне знаходзіцца яшчэ адзін цікавы двухбаковы абраз, таксама старажытны. На адным баку выява святой вялікамучаніцы Параскевы Пятніцы, а на адваротным – выява Нараджэння Святой Багародзіцы, у гонар чаго і была пабудаваная царква. Паводле падання, гэта аброчны абраз. Калісьці даўно ў Шарсціне быў моцны падзёж жывёлы, і жыхары абракліся перад гэтым абразом. За одну ноч быў вытканы кавалак палатна і, пасля руплівай малітвы перад гэтым абразом, паклалі тканіну на дарогу і правялі праз яе статак, пасля чаго падзёж жывёлы скончыўся. З тых часоў жыхары Шарсціна кожны год пачалі перадаваць гэты абраз з хаты ў хату. З 2011 года абраз знаходзіцца ў жахаркі вёскі Шарсцін Валянціны Фелькінай.

Ад Валянціны Іванаўны мы даведаліся пра гісторыю абраза. Яна распавяла, як жыхары вёскі Шарсцін уладкоўвалі крыніцу ў пасляваенны час. Дзякуючы ініцыятыве такіх людзей, як Валянціна Іванаўна, атрымалася знайсці сродкі і арганізаваць мясцовых жыхароў, каб крыніца і мясцовасць вакол былі добраўпарадкаваныя.

Цікавы і такі факт. У першыя гады пасля Чарнобыльскай катастрофы вёска Шарсцін знаходзілася на краі зоны адчужэння і людзі з'язджалі на іншае месца жыхарства. Але нават у гэты час не пераставалі клапаціцца пра крыніцу.

### Архітэктурны эскіз уладкавання крынічкі

У нашай СШ № 19 добра развіты архітэктурна-мастацкі напрамак, таму жыхары Гомеля называюць яе «мастацкай».

Пасля наведвання крынічкі, размовы з В. Фелькінай, святаром А. Булацкім, з людзьмі, якія наведваюць крыніцу, у нас з'явілася ідэя стварыць архітэктурны праект уладкавання капліцы. Першы крок – стварэнне эскіза капліцы над крыніцай.

Капліца над крынічкай у вёсцы Шарсцін па ўспамінах старых людзей мела памеры 4 х 4 м, была драўлянай, зробленая з якаснага лесу, мела два вакна з вельмі прыгожымі аканіцамі. У памяшканні любы чалавек мог адпачыць, памаліцца перад абразамі, выпіць крынічнай вады. Такі від капліцаў называюць вадасвятным. Яна ўладкоўваецца над крыніцай у выглядзе закрытага збудавання плошчай ад 4 да 30 м², вышыня павінна быць не менш 3 м.

Мы вырашылі падзяліцца думкай пра адраджэнне капліцы над крыніцай з настаўнікамі нашай школы. У выніку было вырашана напачатку правесці конкурс малюнкаў-эскізаў капліцы.

Тут прадстаўленыя творчыя працы, выкананыя вучнямі школы, з якіх далей можна будзе адабраць найбольш прыдатны эскіз для стварэння будучай капліцы.

### Заключэнне

Прыспеў час кожнаму не толькі ўспомніць пра свае карані, пра месца, дзе засталася часцінка душы, але і аддаць доўг гэтаму кавалку зямлі.

Мы маем усе падставы ганарыцца такімі ўнікальнымі аб'ектамі прыроды, як крыніцы. Яны, як ніякі іншы водны аб'ект, патрабуюць нашага клопату і беражлівай аховы. У свеце няма нічога больш каштоўнага, чым самая звычайная чыстая вада. Найважнейшай умовай захавання свайго роднага кутка становіцца добраўпарадкаванне крыніцаў, безумоўнае выкананне мераў аховы прылеглай тэрыторыі.

Далейшымі этапамі па рэалізацыі нашага праекта будзе стварэнне макета, распрацоўка праектнай дакументацыі і пошук фундатараў для збудавання капліцы над крынічкай у вёсцы Шарсцін.

[1] *Друкуецца з нязначнымі скарачэннямі*



*Эскізы капліцы*

# Гендарныя аспекты шкаданоснай магіі ў народнай культуры беларусаў Падзвіння

*Даклад Ірыны Бондар, студэнткі гуманітарнага факультэта Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта*

У свядомасці прадстаўнікоў беларускай традыцыйнай культуры, незалежна ад рэгіёну, існуе вобраз людзей, якія валодаюць звышнатуральнымі здольнасцямі і могуць уплываць на знешні свет як у пазітыўным, так і ў негатыўным ключы. Уяўленні пра асоб, якія могуць аказваць шкаданосны ўплыў на навакольны свет, застаюцца даволі трывалымі і ў сучаснай культуры вясковага насельніцтва Беларусі. На тэрыторыі Падзвіння такія людзі найчасцей маюць назву *чараўнік* і *чараўніца*, радзей – *вядзьмак* (*ведзьма*), альбо *калдун* (*калдунья*). Разам з тым, вобраз чараўніка (чараўніцы) у традыцыйнай карціне свету далёка не стэрэатыпны і мае шмат нюансаў, не ў малой ступені абумоўленых гендарнымі фактарамі.

У народнай інтэрпрэтацыі мужчыны і жанчыны, якія валодаюць магічнымі здольнасцямі, істотна адрозніваюцца, бо жаночае чарадзейства заўсёды разглядаецца як з'ява ніжэйшага парадку, звязаная з гаспадарчымі справамі, чым мужчына-чараўнік практычна не займаецца. Вядомы даследчык народнай культуры Віцебшчыны М. Нікіфароўскі адзначаў, што чарадзеямі могуць быць як мужчына, так і жанчына. Ён піша, што жанчыны звычайна займаліся «бабскімі справамі» – чараваннем хатняй скаціны, псотай на палетках і да т.п. Мужчыны ж, хоць таксама могуць гэта рабіць, але амаль ніколі не апускаюцца да такіх заняткаў.

Шырока распаўсюджаным уяўленнем адносна ведзьмаў з'яўляецца і матыў іх ператварэння ў розных жывёл, калі фізічныя пашкоджанні, нанесеныя апошнім, дазваляюць выявіць ведзьму ў вясковым соцыуме

Пад «бабскі справамі» маецца на ўвазе адабранне малака ў кароў, а таксама псаванне іх, насыланне хвароб, сурокі, заломы на неўраджай, падлогі, але гэта характэрна для XIX – XX стст. У большасці выпадкаў чараўнікі шкодзілі сваім суседзям, і прычынай, як правіла, былі побытавыя канфлікты. Фальклорныя наратывы пра ведзьмаў-малочніц у значнай колькасці зафіксаваныя этнаграфічнымі экспедыцыямі ПДУ практычна ва ўсіх раёнах Віцебшчыны. «*У аднаго хазяіна нехта адабраў у каровы малако. Ён пайшоў да знахара, а той яму сказаў: “Паглядзі добра, што ў цябе ў хляве ёсць”. Вярнуўся дамоў хазяін, а каля дзвярэй у хлеў сядзіць жаба. Ён за сякеру і адсёк ёй лапу [...] А заўтра яго дачка з парубленай рукой хадзіла і плакала*» (Ушацкі р-н).

У другой палове XX – пачатку XXI ст. актуальным сюжэтам у апавяданнях пра чарадзейства з'яўляецца ўзгадка пра шкодныя *падлогі* – наўмыснае і таемнае размяшчэнне ў жыццёвай прасторы чалавека рэчаў ці прадметаў з выразнай сімволікай смерці або хваробы. Актуалізацыя чараў супраць асабістай долі чалавека (здароўя, сямейнага ладу) ці яго прысядзібнай гаспадаркі абумоўлена тымі абставінамі, што пагалоўе хатняй жывёлы як аб'ект магічнага ўздзеяння радыкальным чынам зменшылася. «*І аднажды я ўвідзела сваю саседку, выбігающчай [...] Всё там падкладавалі [...] всякія вузлы накручана [...] Ані ж тагда не должны з кем-та разговаріваць [...] І клубніка была красная і крупная, вся высохла до едзінава! [...] І я нашла там пакет такой, чэво-та там накручана*» (Верхнядзвінскі р-н); «*Адна баба адбіла ў другой мужыка. [...] І тут пачала гэта другая сохці, бо першая падкінула ёй яйка пад хату. Другая жонка спужалася і кінула тое яйка ў раку. Яна сразу ж палепшыла, але мужык той памёр*» (Ушацкі р-н).

Шырока распаўсюджаным уяўленнем адносна ведзьмаў з'яўляецца і матыў іх ператварэння ў розных жывёл, калі фізічныя пашкоджанні, нанесеныя апошнім, дазваляюць выявіць ведзьму ў вясковым соцыуме. «*Дружыў парэнь з дзяўчонкай. Як толькі сядуць на лавачцы, а кошка бегаець [...] не даець ім пасядзець [...] Тады [...] узяў з сабой тапор і як толькі кошка бегла, ён ёй па лапе і адсек лапу. [...] Прыходзіць, а маць на печы ляжыць. [...] Эта сын мацеры руку адсек*» (Лепельскі р-н).

Мужчыны-чараўнікі заўсёды лічыліся мацнейшымі за жанчын-чараўніц. «*Чараўнікі [...] І бабы і мужыкі бываюць. Але сіла ў мужчыны ёсь крапчэйшая*» (Сенненскі р-н); «*Мужыкі болей чаравалі, большая сіла ў іх была*» (Чашніцкі р-н). Чараўнікі падзяляліся паводле сваёй кампетэнцыі (сілы) на «сапраўдных» (моцных) і «слабых». Прынцыповае адрозненне паміж імі заключалася ў тым, што «слабы» чараўнік мог толькі шкодзіць людзям, а «моцныя» – маглі як шкодзіць, так і дапамагаць. Гэтае адрозненне ляжыць у аснове канфлікту або спаборніцтва паміж «слабымі» і «моцнымі» чараўнікамі. «*Адзін хваліцца, што я ўмею. І другі [...] “Раз ты ўмееш дзелаць, то ідзі, Вікенцій [...] прынясі мне рэдзьчыну” [...] Пайшоў дзед і прынёс рэдзьчыну. Тады гаворыць: “Возьмі яе разрэж. На табе кусок, і мне кусок. Калі вы зделаецца, каб яна была чорная, а тады белай назад”. Гэты ўзяў і здзелаў яе чорнай, і гэты ўзяў – чорнай. Ну а тады, гавораць: “Здзелай белую”. Дык адзін здзелаў, а другі не здзелаў. Дык гэты, каторы чорную здзелаў і белую, падышоў і гэтай рэдчынай як удзяліў яму ў морду!*» (Талачынскі р-н).

Заўважым, што падобны матыў адсутнічае ў фальклорных наратывах пра ведзьмаў, якія ў традыцыйнай карціне свету беларусаў былі суаднесены толькі са шкаданоснай дзейнасцю.

У другой палове XX – пачатку XXI ст. актуальным сюжэтам у апавяданнях пра чарадзейства з'яўляецца ўзгадка пра шкодныя *падлогі* – наўмыснае і таемнае размяшчэнне ў жыццёвай прасторы чалавека рэчаў ці прадметаў з выразнай сімволікай смерці або хваробы

Статус чараўнікоў заўсёды ацэньваецца больш высока за статус чараўніцаў, бо менавіта мужчынам была ўласцівая ўлада над ваўкамі, змеямі, пчоламі, а таксама прыроднымі стыхіямі. «Моцныя» чараўнікі маглі выклікаць град, віхор, буру. «*А яшчэ баба адна гаварыла, што сама бачыла, як Дрозд вызываў віхор на пшаніцу. [...] А ён стаіць каля поля, каля пшаніцы, раскінуў рукі і пачаў імі махаць. І раптам як узняўся сільны вецер, які ўсю пшаніцу паклаў на зямлі*» (Мёрскі р-н).

Дагэтуль захоўваецца вера ў сувязь чараўнікоў і знахараў з паўзунамі (змеямі); ёсць асобае правіла аб тым, што «людзям ведаў» нельга забіваць змей. Гэты закон строга выконваўся чараўнікамі і знахарамі. «*Так ён [...] браў любую змею рукамі. Он знаў, гдзе яе узяць. І ні адна змея (не кусала). Вот пасадзіць на руку і гладзіць яе, [...] і змея яго нікагда не ўкусіць. Нікагда!*» (Полацкі р-н).

Прасочваецца адметная сувязь чараўнікоў і з ваўкамі. Існуе тры сюжэтныя лініі «ваўчынай тэмы», калі чараўнік: мае мыгчымасць ператварацца ў ваўка, або ператварае ў ваўкоў іншых людзей, ці кіруе ваўкамі і кантралюе іх. Матыў ператварэння ў ваўка вядомы яшчэ з часоў ранняга сярэднявечча, калі такая здольнасць прыпісвалася легендарнаму полацкаму князю Усяславу Брачыслававічу.

Таксама чараўнікі выступаюць і як магічныя гаспадары ваўкоў. «*І вот у нас там расказвыла адна жэншчына [...] Яна ідзець, а ён кажа на яе, гэты Васіль: “Ты хочаш ваўка ўвідзець?” А яна кажаць: “Хачу. І вот перада мной сейчас становіцца волк. Я, – гаворыць, – анямела, стала, не знаю, што мне рабіць. Ай, не хачу ўжо відзець яго”. – “Счас, – гаворыць, – ваўка не станіць”*» (Ушацкі р-н).

Найчасцей з'явы ператварэння чараўнікам людзей у ваўкоў сустракаюцца ў кантэксце вясельнага сцэнарыя. Звяртае на сябе ўвагу тое, што гэтае ператварэнне выконвае функцыю пакарання за парушэнне традыцый і сацыякультурных нормаў. Напрыклад, за ігнараванне статуса чараўніка або за непавагу да яго на вяселлі. «*Адна пара жанілася, свацьба ў нас была. А саседа ні прыгласілі. А ён што здзелаў. [...] Дык дзеўка гэта ваўчыцай абярнулася, а жаніх – ваўком, бегаюць па полю. Дык таго чалавека прыгласілі, напаілі. А каб аддзелаць, ён іх цераз ізгароду турнуў. Во, як было*» (Ушацкі р-н).

Чараўніцтва закранала ўсе сферы жыццядзейнасці чалавека, то бок, яго фізічнае і псіхічнае здароўе, сямейныя і грамадскія ўзаемаадносіны, гаспадарчыя і прафесійныя заняткі. Моцныя чараўнікі мелі свае функцыі ў вясковым соцыуме. Калі ў вёсцы быў такі моцны чараўнік, то яго абавязкова звалі на вяселле, а ведзьмаў амаль ніколі не запрашалі. Такім чынам чараўнік падтрымліваў сваю асабістую тайную ўладу ў вёсцы. Ён выступаў своеасаблівым абярэгам для маладых, мог выявіць і абясшкодзіць чары, што былі на маладых, або пакараць таго, хто збіраўся гэта зрабіць або ўжо зрабіў. Але калі чараўніку не давалі належнай увагі, то тады вяселле магло скончыцца сумна: «*Вот я гэта, як вышла замуж у дзярэўню Пранікі. Там расказвалі, была свадзьба, і аднаго мужчыну там не ўгасьцілі: не далі там выпіць. Ну і ён [...] падробіў маладой, што яна завалілася, як нежывая. Тады і дагадаліся. І ўгасцілі. І ўсе было харашо*» (Ушацкі р-н). Аналагічную з'яву, калі чараўнік на вяселлі карае непрыяцеляў, яшчэ ў першай палове XIX ст. апісаў Я. Баршчэўскі, што ўказвае на трывалы і кансерватыўны характар падобных уяўленняў у традыцыйным светапоглядзе беларусаў Падзвіння.

Аналіз фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў паказвае, што статус чараўніка ў народнай культуры Паўночнай Беларусі быў больш высокі за статус чараўніц, якія займаліся выключна шкаданоснай магіяй. Аднак, наратывы пра чараўнікоў, што фіксуюцца на Падзвінні ў апошнія дзесяцігоддзі, маюць пераважна характар успамінаў пра рэаліі 1950 – 1970 гг. Як актуальная з'ява сучаснага сельскага ландшафту Віцебшчыны мужчыны-чараўнікі ўжо практычна не ўзгадваюцца. На сённяшні дзень у апавяданнях пра чарадзейства найбольш фігуруюць жаночыя вобразы. Пры гэтым, у адрозненне нават ад сярэдзіны XX ст., адбываецца зрушэнне сферы дзейнасці, калі меркаваныя ведзьмы пераносяць свае шкаданосныя практыкі з хатняй жывёлы і палеткаў на здароўе людзей і іх асабісты лёс.




***Хрысціянская традыцыя пакінула і працягвае пакідаць у нашай культуры адметны след. Вялікая колькасць помнікаў архітэктуры, манументальных фрэсак і твораў іканапісу заўсёды прыцягвала людзей. Гэтым разам хачу расказаць пра адзіны драўляны касцёл у Іўеўскім раёне, што знаходзіцца ў вёсцы Дуды. Свой пачатак гэтая каталіцкая святыня бярэ з XVII стагоддзя.***


Касцёл у вёсцы Дуды

# Драўляны касцёл у вёсцы Дуды

У 1608 годзе Дудскае староства знаходзілася ва ўладанні віленскага ваяводы К. Хадкевіча. Як сведчаць архіўныя дакументы, у тым годзе ён выдзеліў на касцёл у Дудах значныя ахвяраванні. Такім чынам, хоць датай заснавання дудскага касцёла і лічыцца 1608 год, атрымліваецца, што ў гэты час святыня ўжо існавала.

Храм быў нанова адбудаваны ў 1712 годзе. У 1772-м яго рэканструявалі, а ў 1781 годзе віленскі біскуп Тамаш Зяньковіч урачыста кансэкраваў святыню пад тытулам Нараджэння Найсвяцейшай Панны Марыі.

Касцёл стаіць у цэнтры вёскі. У 1908 годзе ён быў рэканструяваны. З таго часу ўяўляе сабой драўляны залавы аб'ём на каменным падмурку з пяціграннай апсідай, фланкаванай дзвюма квадратнымі сакрыстыямі. Галоўны фасад фланкаваны дзвюма магутнымі чацверыковымі вежамі, якія да пачатку XX стагоддзя былі двух'яруснымі і ўвенчваліся чатырохсхільнымі купаламі з заломам пад барокавымі фігурнымі галоўкамі.

Трэці ярус вежаў і шатры над імі з'явіліся падчас рэканструкцыі 1908 года, карункавыя крыжы пры гэтым захаваліся і былі паднятыя на новую вышыню. Аднак заўсёды касцельныя вежы былі дэкаратыўнымі, званіца – двух'ярусная, чацверыковая, пад чатырохсхільным дахам – была пабудаваная асобна, у левым куце касцельнай агароджы пры ўваходзе. Касцёл накрыты двухсхільным дахам (калісьці быў ґонтавы, сёння – бляшаны) з вальмамі над апсідай, вільчык над алтаром калісьці быў завершаны гранёнай барокавай галоўкай-сігнатуркай.

Інтэр'ер перакрыты скляпеннем, што ўпрыгожанае размалёўкамі ў стылі мадэрн. У святыні тры драўляныя алтары, выкананыя ў стылі барока. У галоўным, двух'ярусным, паміж калонамі карынфскага ордэра ў цэнтры змешчаны абраз Маці Божай Дудскай, наверсе – разьбянае Укрыжаванне ў акружэнні фігураў анёлаў. Кампазіцыя і дэкор бакавых алтароў (левага – Святога Крыжа, і правага – св. Нікадзіма) падобныя да галоўнага.


Абраз Найсвяцейшай Панны Марыі

Як сведчыць легенда, цудадзейны абраз Маці Божай, што сёння знаходзіцца ў галоўным алтары касцёла, спачатку з'явіўся ў суседняй вёсцы Лугамавічы на суку дрэва. Цягам наступных чатырох гадоў абраз тройчы з'яўляўся ў Дудах. З таго часу ён вядомы як абраз Маці Божай Дудскай.

Многа цікавых згадак засталося ў расказах людзей пра гісторыю храма. Так, яго любіў наведваць лугамавіцкі пан Самуэль Воўк. Пра жорсткасць гэтай асобы, упраўляючага лугамавіцкім маёнткам, піша нават Адам Міцкевіч у паэме «Пан Тадэвуш». Непадалёк касцёла, на яго тэрыторыі, пахаваная жонка пана Воўка.

Тэрыторыя касцёла на пачатку XX стагоддзя была абнесеная мураванай пабеленай агароджай, уваход пазначаны брамай у выглядзе чатырох слупоў.

Пасля падаўлення паўстання 1863 – 1864 гадоў дудская парафія была пазбаўленая самастойнасці, бо ў другой палове XIX стагоддзя касцёл Нараджэння Найсвяцейшай Панны Марыі пазначаецца як філіяльны ад іўеўскай парафіі. Але з 1920-х гадоў самастойнасць дудскай парафіі была адроджаная. Была пабудаваная капліца ў вёсцы Казевічы. Перад Другой сусветнай вайной колькасць парафіянаў складала прыкладна 5000 чалавек.

У савецкі час касцёл дзейнічаў бесперапынна, хаця парафія афіцыйна была знятая з рэгістрацыі. У 1959 годе касцёл Нараджэння Найсвяцейшай Панны Марыі быў закрыты. У ім размясцілі калгасны склад. Аднойчы пайшлі чуткі, што прыедзе трактар, каб вырваць з храма галоўны алтар. Трактар сапраўды прыйшоў. Аднак людзі леглі на зямлю перад ім, пачалі плакаць, крычаць. Трактарыст выйшаў і прапанаваў міліцыянеру сесці за руль трактара. Той таксама адмовіўся. Так людзі выратавалі алтар.

Цягам усіх гадоў забыцця гэтай святыні вернікі пісалі шмат прашэнняў, ездзілі па розных інстанцыях (нават у Маскву), прасілі за храм. І дабіліся свайго. У 1980 годзе касцёл адкрылі. А ў 1986 годзе сюды з Іўя адпраўляць богаслужэнні прыязджаў ксёндз Леанід Нясцюк (вядомы сваёй дзейнасцю ў Гярвятах; на вялікі жаль, гэтага чалавека ўжо няма сярод нас). Потым Дуды атрымалі свайго святара. У 1990 годзе адбылася чарговая рэстаўрацыя храма. У нашыя дні ён застаецца дзейным і знаходзіцца ў вельмі добрым стане. Сённяшні святар дудскага касцёла – Вячаслаў Матукевіч, выпускнік Гродзенскай вышэйшай духоўнай семінарыі. Да Дудаў нёс сваю духоўную службу вікарыем у прыходах Жалудка, Ваўкавыска, Астраўца і Ліды. Ксёндз лічыць, што яму дасталася вялікая духоўная спадчына ад іншых святароў, якія служылі раней у касцёле Нараджэння Найсвяцейшай Панны Марыі.

Тэрыторыя вакол храма акружаная каменнай агароджай, а побач захавалася драўляная званіца, якая, як і храм, была ўзведзеная ў XVIII стагоддзі. Не так ужо і шмат можна знайсці ў Беларусі выдатна захаваных драўляных пабудоваў сярэдзіны XVIII стагоддзя, да якіх адносіцца касцёл Нараджэння Найсвяцейшай Панны Марыі ў вёсцы Дуды – цікавая беларуская славутасць і вельмі каштоўны архітэктурны помнік.


Галоўны алтар

*Іван ЗАХАРЭВІЧ, г. Іўе*

# Памятныя мясціны Першай сусветнай вайны ў Мінску



***У гэтым артыкуле даецца характарыстыка найбольш значных памятных мясцінаў у Мінску, звязаных з падзеямі Першай сусветнай вайны, і раскрываецца ступень іх мемарыялізацыі.***

Памятныя месцы, звязаныя з падзеямі Першай сусветнай вайны, што знаходзяцца на тэрыторыі Мінска, прадстаўлены аб'ектамі ў наступных катэгорыях:

могілкі: Брацкія вайсковыя могілкі на вуліцы Чарвякова;

храмы: храм-помнік у гонар Усіх святых і ў памяць аб ахвярах, выратаванню Айчыны нашай паслужылых;

будынкі: будынак Мінскага ваеннага Сувораўскага вучылішча (былы Серафімаўскі шпіталь, што знаходзіўся ў будынку Мінскай духоўнай семінарыі); будынак, дзе знаходзілася Беларускае таварыства па аказанні дапамогі пацярпелым ад вайны (цяпер у ім размяшчаецца філіял Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры «Беларуская хатка»); лазарэт Чырвонага Крыжа ў доме мінскага губернатара; дом Маліна, дзе знаходзіўся будаўніча-тэхнічны аддзел Заходняга фронту (сучасны будынак па вуліцы Валадарскага, 9);

ваенныя аб'екты: аэрадром, што знаходзіўся на тэрыторыі сучаснага мікрараёна Серабранка; будынак, дзе размяшчаўся штаб Заходняга фронту (вуліца К. Маркса, 36); будынак былой гасцініцы «Парыж», дзе з 1915 г. знаходзіўся штаб Паўночна-Заходняга фронту (сучасны будынак па вуліцы Ф. Энгельса, 14).

Зыходзячы з сучаснага стану гэтых аб'ектаў, іх інфарматыўнасці, важнасці для раскрыцця падзеяў Першай сусветнай вайны і экскурсійна-краязнаўчага патэнцыялу, найбольш значнымі з іх можна лічыць:

1. Брацкія вайсковыя могілкі на вуліцы Чарвякова.

2. Дом мінскага губернатара.

3. Будынак Беларускага таварыства па аказанні дапамогі пацярпелым ад вайны.

4. Храм-помнік у гонар Усіх святых і ў памяць аб ахвярах, выратаванню Айчыны нашай паслужылых.

Паспрабуем прасачыць гісторыю гэтых аб'ектаў і раскрыць ступень іх мемарыялізацыі.

Мінскія брацкія вайсковыя могілкі ўзніклі праз месяц пасля пачатку ваенных дзеянняў. Да пытання арганізацыі могілак актыўна падключыліся органы гарадской улады і ваеннага кіраўніцтва. Планавалася стварыць не адны, а некалькі брацкіх могілак. Але ў выніку былі створаныя Мінскія вайсковыя брацкія могілкі, што знаходзіліся паміж Віленскім і Даўгінаўскім трактамі (цяпер – Старавіленскі тракт і вуліца Чарвякова). Работы былі арганізаваны даволі хутка, бо неўзабаве сталі прыбываць параненыя з фронту, многія з якіх паміралі ў шпіталях. З 29 лістапада 1914 г. там пачаліся пахаванні, а ў канцы года была ўсталявана агароджа.



Брацкія вайсковыя могілкі на вуліцы Чарвякова

У 1915 г. Мінск – прыфрантавы горад. Загінулых стала значна больш, горад напоўніўся бежанцамі. Таму могілкі для вайскоўцаў пашырылі, а побач з імі арганізавалі могілкі для бежанцаў, якія праз некалькі месяцаў былі далучаныя да вайсковых. У 1915 г. завяршылася будаўніцтва на могілках драўлянай капліцы, якая пазней атрымала статус царквы.

Брацкія могілкі з дня свайго заснавання адразу ствараліся як мемарыяльныя. У адпаведнасці з законам Расійскай імперыі, кожнага вайскоўца павінны былі пахаваць у асобнай магіле і ў труне, а брацкімі могілкі называліся ў гонар воінскага братэрства. Згодна з законам, могілкі ствараліся з улікам рэлігійнай прыналежнасці загінулых. На могілках паміж Віленскім і Даўгінаўскім трактамі былі пахаваныя толькі праваслаўныя воіны. Да 1918 г. на іх было пахавана 5 тысячаў чалавек.

Пасля рэвалюцыі Першая сусветная вайна была названая імперыялістычнай, а салдаты, якія загінулі на яе франтах, сталі лічыцца ахвярамі, а не героямі вайны. Брацкія могілкі аказаліся занядбанымі. Яны яшчэ існавалі ў 1930-я гг., але царква была ўжо знесеная. У жніўні 2011 г. на тэрыторыі могілак адкрылі мемарыял, у які ўваходзіць капліца і гранітныя пліты з імёнамі загінулых салдатаў.

Адным з прыярытэтных напрамкаў у дзейнасці Расійскага таварыства Чырвонага Крыжа з'яўлялася арганізацыя сеткі лячэбных установаў у тылавым Мінску. Дзейнасць лазарэтаў Чырвонага Крыжа ажыццяўлялася пры непасрэдным удзеле і падтрымцы мінскіх губернатараў, святароў Мінскай епархіі, настаўнікаў і служачых. Дапамога выражалася ў прадастаўленні памяшканняў, магчымых для выкарыстання пад лазарэты.

Адным з першых у 1914 г. пры садзейнічанні мінскага губернатара А. Гірса быў адкрыты лазарэт Чырвонага Крыжа ў доме губернатара (былы езуіцкі калегіум) на Саборнай плошчы. Яго ўзначальваў старшы ўрач С. Урванцоў. 22 кастрычніка таго ж года шпіталь наведаў імператар Мікалай II, які ўручыў параненым салдатам Георгіеўскія крыжы.



Былы дом мінскага губернатара

*Павел АЛІСІЕВІЧ,*
*студэнт Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка*

**(Заканчэнне будзе)**

# Крыжовыя дарогі Юрыя Тарасюка

***Шмат гадоў прайшло з таго часу, калі 17 верасня 1939 г. адбылася важная гістарычная падзея – Беларусь вярнула сабе заходнія землі, якія амаль два дзесяцігоддзі былі ў складзе буржуазнай Польшчы. Розныя былі меркаванні ў мясцовых жыхароў пра тую падзею: некаторыя трымалі нейтралітэт, чакалі, што будзе далей, многія былі супраць, асабліва тая частка сялянства, якая мела добры надзел сваёй зямлі, а былі і такія, хто аддаваў сілы і маладую энергію душы дзеля таго, каб наблізіць доўгачаканы час яднання. Сярод іх – Юрый Аляксандравіч Тарасюк з г.п. Казлоўшчына Дзятлаўскага раёна.***

Сям'я Тарасюкоў у 1930-я гг. актыўна ўдзельнічала ў нацыянальна-вызваленчым руху Заходняй Беларусі. Прагрэсіўных поглядаў прытрымліваўся бацька Юрыя – Аляксандр, сыны Міхась і Юрый, а таксама сястра Клава, якая дапамагала братам-падпольшчыкам, выконвала ўсе іх даручэнні, удзельнічала ў мітынгах, распаўсюджвала нелегальную літаратуру. Клаву закатавалі фашысты ў 1942 г. у Слоніме. Братоў Міхася і Юрыя напаткаў лёс многіх заходнебеларускіх змагароў – яны пасля вайны апынуліся ў сталінскіх лагерах, дзе Міхась загінуў, а Юрый шмат гадоў правёў у нечалавечых умовах.

У архівах Дзятлаўскага гісторыка-краязнаўчага музея знаходзяцца ўспаміны Ю. Тарасюка, запісаныя ў 1980-я гг. Фёдарам Фёдаравічам Красюком, былым дырэктарам музея. У іх ветэран-падпольшчык, член КСМЗБ распавядае пра тыя далёкія гады.

Нарадзіўся Ю. Тарасюк 7 красавіка 1913 г. у вёсцы Лявонавічы Дзятлаўскага раёна. Бацька яго быў настаўнікам царкоўнапрыходскай школы, маці – хатняй гаспадыняй. Пад час Першай сусветнай вайны сям'я эвакуявалася на ўсход, пачаліся блуканні на прасторах Расійскай імперыі.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі бацька быў прыняты на працу ў губчэка г. Саратава, дзе жыла сям'я. Арганізаваў школку, дзе навучаў мясцовых дзяцей граматы. У 1920-я гг. сям'я вырашыла вярнуцца дадому. Калі прыехалі ў Мінск, даведаліся, што родныя мясціны знаходзяцца пад уладай Польшчы. Цягніком даехалі да Баранавічаў, адтуль – у Слонім, а са Слоніма на кані – да Казлоўшчыны.

Польскія ўлады падазрона ставіліся да тых, што вяртаўся з Савецкай Расіі, бацьку Ю. Тарасюка называлі бальшавіком. Неўзабаве бацька падаў прашэнне аб адкрыцці беларускай школы, бо ў вёсцы Задвор'е знайшоў ахвотных вучыцца. Спачатку ўлады дазволілі адкрыць школу, але праз некалькі дзён паліцыя прыехала ў вёску, дзяцей адправілі дахаты, а школу закрылі. Дом, у якім жыў Ю. Тарасюк, ператварыўся ў месца, дзе збіраліся прагрэсіўна настроеныя людзі акругі. Сюды прыходзілі Віктар, Уладзімір і Анатоль Мазалі, Павел Якубчык і многія іншыя. Людзі гаварылі пра палітыку, пра сваё беднае сялянскае жыццё, спявалі беларускія песні, ставілі спектаклі. Крыху пазней вырашылі арганізаваць бібліятэку, пачалі збіраць кнігі. Паліцыя была незадаволеная такой актыўнай дзейнасцю, пагражала забараніць спектаклі, бо здагадвалася, што пад прыкрыццём культурных мерапрыемстваў актыўна дзейнічалі мясцовыя камуністы і камсамольцы. Лідарам камуністаў быў В. Мазоль. Сам Ю. Тарасюк у той час быў ужо камсамольцам. Членамі арганізацыі сталі таксама А. Мазоль, Уладзімір Лябецкі, Аляксандр Лябецкі. Перад камсамольцамі і камуністамі стаяла задача пашыраць нацыянальна-вызваленчы рух. У Казлоўшчыну паступала шмат падпольнай літаратуры: лістоўкі, газеты, кнігі. Яе хавалі ў хлявах, у гумнах, бо дома трымаць баяліся: калі знойдзе паліцыя, гаспадару пагражаў вялікі тэрмін зняволення.

У Казлоўшчыне Юрый вучыўся ў польскай школе, а пасля заканчэння ў 1927 г. паступіў у Віленскую беларускую гімназію. Там пачалося актыўнае падпольнае жыццё: падпольная арганізацыя гімназіі мела сувязь з гарадскімі арганізацыямі КПЗБ і КСМЗБ. Камсамольцы гімназіі ўдзельнічалі ва ўсіх рэвалюцыйных выступленнях гарадскіх арганізацыяў. Так паступова Ю. Тарасюк падключыўся да падпольнай барацьбы ў Вільні. Што рабіла моладзь, у чым заключалася іх падпольная дзейнасць? Яны развешвалі чырвоныя сцягі ў людных месцах, расклейвалі і раскідалі лістоўкі, іншую літаратуру, якую друкавалі ў Вільні або прысылалі з Варшавы, удзельнічалі ў дэманстрацыях. Канспірацыя была строгая. Кожны ведаў толькі тое, што павінен быў ведаць. Гэта рабілася дзеля таго, каб не выдалі таварышаў, калі трапяць у дыфензіву. Забастоўкі таксама рыхтавалі ў строгай канспірацыі.

За час вучобы ў Віленскай гімназіі Юрый зблізіўся з Валянцінам Таўлаем – земляком са Слонімшчыны і будучым вядомым паэтам, вучыўся з ім у адным класе, нават сядзеў за адной партай. Валянцін быў камсамольскім лідарам. У час вучобы давялося Юрыю пабыць і вязнем Гродзенскай турмы – адседзеў у малюсенькай камеры ўсю зіму 1929 – 1930 гг. Судзілі камсамольцаў у Слоніме. Юрыю было тады 17 гадоў, Таўлаю – 16. Далі хлопцам па тры гады ўмоўна, Юрый быў вымушаны вярнуцца ў Казлоўшчыну. Тут ён адразу падключыўся да камсамольскай працы, аднак пастаянна знаходзіўся пад наглядам паліцыі. Таму вырашыў паехаць назад у Вільню. Праз некаторы час было адмененае рашэнне слонімскага суда, у Вільні адбыўся новы суд, які прысудзіў Ю. Тарасюка і двух яго таварышаў да 5-і гадоў зняволення. Хлопцам удалося схавацца і праз некаторы час перайсці мяжу. Так яны апынуліся ў Савецкай Беларусі. З пагранічнай заставы іх забраў прадстаўнік КПЗБ і перавёз у Мінск. Маладых людзей забяспечылі працай. Юрый каля двух гадоў працаваў у Камісіі па вывучэнні Заходняй Беларусі пры Акадэміі навук БССР.

Аднойчы Тарасюка і Таўлая выклікалі ў ЦК партыі, у кабінет другога сакратара. Было вырашана накіраваць іх у Заходнюю Беларусь для працы ў падполлі. Таўлай паехаў вясной 1933 г., а Юрый павінен быў ехаць восенню, але яго нечакана накіравалі ў падпольную партыйную школу КПЗБ. Там ён прабыў нядоўга, ужо 27 жніўня Юрыя на спецыяльнай машыне адвезлі ў УНК (Усесаюзная надзвычайная камісія) і пад рукі завялі на самы верхні паверх, пасадзілі на табурэтку і пачалі праводзіць паўз яго відных дзеячаў падпольнай барацьбы ў Заходняй Беларусі – дэпутатаў польскага сейма: Мятлу, Рак-Міхайлоўскага, Бурсевіча, Дварчаніна, Гаўрылюка. Навошта гэта рабілася, хлопец тады не зразумеў. Калі ж яго завялі ў кабінет да следчага, ён наіўна кінуўся распытваць, чаму гэтыя людзі тут: яны ж камуністы, старыя бальшавікі. Следчы скоса паглядзеў на Юрыя і пачаў допыт. Праз паўгадзіны Юрый ужо сядзеў у камеры.

Толькі на наступным допыце стала зразумела, што хлопца абвінавачваюць у антысавецкай дзейнасці. Пытанні следчага былі наступныя: «Кім і калі завербаваны? Якія заданні выконваў?» Юрый адмовіўся адказваць на пытанні. Допыты ішлі па некалькі гадзінаў, выкарыстоўвалі перакрыжаваныя пытанні, блытаклі. Працягваліся допыты тыдні тры, затым хлопца адправілі ў гарадскую турму, у агульную камеру. Усе, хто там сядзеў, не ведалі сваіх справаў, не разумелі, у чым іх абвінавачваюць.

Выклікалі яго яшчэ некалькі разоў. Тыя ж пытанні, але ён усё адмаўляў. Дапытвалі начальнік сакрэтнага палітычнага аддзела па прозвішчы Годзін, следчы па прозвішчы Дэйкаў і яшчэ некалькі чалавек. Юрый упарта працягваў даказваць сваю невінаватасць, нарэшце не вытрымаў і сказаў: «Ведаеце, я вінаваты толькі ў тым, што згадзіўся перайсці мяжу і прыбыць сюды, у Савецкі Саюз. Толькі ў гэтым я лічу сябе вінаватым».

Юрый прасядзеў у агульнай камеры доўга. Праз сцяну сядзеў Валюшын, адзін з кіраўнікоў Грамады, яго трымалі ў адзіночцы. Толькі ў лютым усіх выстраілі на калідоры, пачалі выклікаць да століка, за якім сядзеў ахоўнік, і аб'яўляць тэрміны пакарання: «Дзесяць гадоў, на Поўнач, артыкул 58 – 6.11». Вось і ўвесь суд. Потым зняволеных адправілі ў нейкі клуб. Калі там сабралася каля дзвюх тысячаў чалавек, усіх павялі на вакзал. Ішлі пешшу, калонай. Юрый адчуваў жах, не разумеў, што адбываецца, за што ён стаў злачынцам.

Праз некалькі дзён была Масква, перасадка, смерць таварышаў, слабейшых фізічна, Котлас. Далей дарогі не было, ад Котласа да г. Чыб'ю (цяпер Ухта) павялі пешшу, кожны дзень ішлі па 25 – 30 кіламетраў. Спыняліся ў спецыяльна пабудаваных прытулках. Прайшлі этапам больш за 800 кіламетраў. У лагеры выконвалі розныя працы, пераважна земляныя і будаўнічыя: ставілі сваі, дзяўблі вечную мерзлату.



*Хата, у якой жыў Тарасюк апошнія гады. У 1920-х гадах тут збіраліся падпольшчыкі Заходняй Беларусі*

Алена АБРАМЧЫК

(Працяг будзе)

# Сын аднаго з паўстанцаў Тадэвуша Касцюшкі

***Да 210-годдзя з дня нараджэння Плакіда Янкоўскага***



*Плакід Янкоўскі*

20 верасня споўнілася 210 гадоў з дня нараджэння святара, празаіка, публіцыста, перакладчыка, паэта, магістра тэалогіі Плакіда Янкоўскага (1810 – 1872).

Родам П. Янкоўскі паходзіць з Камянеччыны. Нарадзіўся ў шляхецкай уніяцкай сям'і. Яго бацька прымаў удзел у паўстанні Тадэвуша Касцюшкі, а пазней прыняў духоўны сан, меў прыход.

Плакід атрымаў добрую адукацыю. Вучыўся ў Свіслацкай гімназіі, скончыў Берасцейскую школу базыльянаў. У 1826 годзе ён – студэнт тэалагічнага факультэта Віленскага ўніверсітэта. Гады навучання Плакіда ва ўніверсітэце адыгралі выключную ролю ў яго лёсе. Пісьменнік вывучыў некалькі моваў, шмат чытаў, у асноўным еўрапейскіх літаратараў.

Пасля заканчэння ўніверсітэта і абароны звання магістра багаслоўя П. Янкоўскі атрымаў пасаду прафесара ў Жыровіцкай уніяцкай духоўнай семінарыі, дзе выкладаў Святое Пісанне і латынь. Паўстанне 1830 – 1831 гадоў і эпідэмія халеры прымусілі П. Янкоўскага пакінуць Жыровічы і пераехаць у Вільню. Але праз год ён зноў вяртаецца ў Жыровічы, дзе рыхтуецца да здачы экзаменаў на доктара тэалогіі і паспяхова здае іх у рымска-каталіцкай духоўнай акадэміі.

У 1837 годзе малады доктар тэалогіі вырашыў памяняць веру. Гэтая пазіцыя была ўхвалена праваслаўнай царквой. Ён быў нават узнагароджаны ордэнам Святой Ганны і іншымі ўзнагародамі Расійскай імперыі і праваслаўнай царквы.

Літаратурная творчасць П. Янкоўскага пачалася з 1830-га. Ён піша вершы, байкі, апавяданні, аповесці, п'есы (на польскай і рускай мовах), запісвае анекдоты, займаецца перакладамі. Шчыра сябруе з гісторыкам, пісьменнікам, калекцыянерам, музыкантам Юзафам Крашэўскім (1812 – 1887). Яны перапісваюцца, сустракаюцца, гутараць пра літаратуру. З друку выходзяць кнігі П. Янкоўскага «Засценак» (1841), «Хвіля» (1842), «Апавяданні» (1843), «Універсітэцкія ўспаміны» (1949) і іншыя.

Пасля задушэння паўстання 1863 – 1864 гадоў творчасць П. Янкоўскага паціху затухае. Ён купіў у Жыровічах дом і дажыў там свае апошнія гады. Памёр святар і пісьменнік у поўнай ізаляцыі ад людзей і свету ў Жыровічах, дзе і пахаваны. Творчасць яго вельмі супярэчлівая, аднак бяспрэчным застаецца той факт, што яго ніколі не былі чужымі Бацькаўшчына і беларускі народ.




У 2004 годзе ўпершыню ў Беларусі (на рускай мове) былі выдадзены асобнай кнігай «Запіскі вясковага святара» П. Янкоўскага; кніга перавыдавалася.

*Сяргей ЧЫГРЫН*

# Адзіная і такая родная ў карцінках

**(Працяг. Пачатак у № 36)**

***Карцінка чацвёртая***. Вялікдзень. На мне надзета новая сукеначка з вясёленькага паркалю і з дзвюма кішэнькамі. Чапляючыся за платы, я іду да сваёй другой бабулі, што жыве недзе на сярэдзіне вёскі. Вуліца ўся ў гразі, і толькі ля платоў бяжыць вузенькая сцяжынка, па якой можна прайсці, трымаючыся за калы. На кладках сядзяць бабулі і жанчыны ў прыгожых тараноўках, новых спадніцах і блузках, трымаючы ў руках чырвоныя яйкі і кавалачкі вялікодных пірагоў. І дахаты я вяртаюся з цяжкімі ад шчодрасці радкаўскіх жанчын кішэнькамі.

***Карцінка пятая***. Зіма. Завея. У двары стаіць запрэжаны ў сані калгасны конік Вася. Татка ў кажуху, цёплых валёнках і шапцы-вушанцы падкідвае мяне да столі і кажа: «Не сумуй, донька, паеду па сена для нашай кароўкі, вярнуся вечарам, чакай, бо я прывязу табе зайчыкавага хлеба і балотнай мяты». Я проста ўліпаю тварыкам у аконнае шкло, каб хоць позіркам правясці любімага тату на тое балота, якое мне здаецца нечым далёкім і страшэнным. Цэлы дзень я хвалююся. А вечарам у двор ледзь уціскаюцца вялізныя сані з сенам. Я выбягаю насустрач татку, а той хуценька падае мне палатняную торбачку: «На, развязвай, а там ляжыць табе пачастунак – зайчыкаў хлеб і мята». Я бягу ў цёплы пакой, развязваю торбачку і з вялікай асалодай ем той хлеб, бо яго ж мне сам зайчык перадаў, і ўдыхаю дзіўны пах сушанай балотнай мяты.

***Карцінка шостая***. Мне гадкоў чатыры. Калгасны палетак. Вясковыя жанчыны, якіх чамусьці завуць паляводамі, полюць ячмень і спяваюць. Я спрабую дапамагчы бабулі, але асот коле дзіцячыя ручкі, якія я хуценька хаваю ў кішэнькі.

***Карцінка сёмая***. За агародамі ляжыць вялікі поплаў. Як сёння сказаць, гектараў з дваццаць. На тым поплаве выкапаны вадаём, каб было дзе паіць вясковы статак. Вада ў тым вадаёме такая мяккая, што ўсёй вёскай людзі ходзяць мыць бялізну. Але самая чароўная дзея – гэта калі жанчыны вымачваюць выбеленае блехам саматканае палатно. Вакол вадаёма па зялёнай траве бягуць белыя сцяжынкі ручнікоў. Прыгажосць несусветная! А пах ад іх такі, што вочы зажмурваюцца ў асалодзе.

***Карцінка восьмая***. Мне сем гадкоў. Я з татам крочу па сцежцы ўздоўж агародаў



*Каля вясковага клуба жыхары в. Радкава, 1953 г.*

да калгаснай кузні. Там працуе дзядуля Адам, які для мяне куе маленькую матычку. Мы заходзім у адчыненыя дзверы, адкуль даносіцца нейкі дзіўны стук-перастук. Гэта працуе каваль над маёй матычкай. А пасля падае яе мне. Матычка яшчэ цёплая, але такая востранькая і з кветачкай на ручцы. Дома тата насаджвае яе на маленькі чаранок і аддае мне: «Памачніца!»

***Карцінка дзявятая***. Вялікае свята Ілья. Па роднай вуліцы ідзе, едзе на вазах і роварах мора людзей і мясцовых, і з навакольных вёсак. Гэта шлях да Крыжа, што размешчаны ў полі між двух калгасаў. Крыж той стаіць на месцы, дзе ў даўніну стаяла драўляная царква. Царква згарэла, новай не пабудавалі, а толькі Крыж узвялі. І на Ілью туды было сапраўднае паломніцтва людзей. Яны перадзявалі ікону, што была на тым Крыжы замацавана, горача маліліся, затым вярталіся назад па маёй роднай вуліцы. Мяне садзілі ў драўляную каляску з дышлем, прыгожа накрывалі і таксама вазілі да таго Крыжа.

*Валянціна БАБКО-АЛЯШКЕВІЧ*

**(Заканчэнне ў наступным нумары)**



*Вучні Радкаўскай пачатковай школы каля сцэнаў роднай школы, 1967 г.*

Наш каляндар

**Ляшчэвіч Антоній Янавіч – мучанік, блажэнны Рымска-Каталіцкага Касцёла – 130 гадоў з дня нараджэння**

Блажэнны Антоній Ляшчэвіч нарадзіўся 30 верасня 1890 г. у вёсцы Абрамаўшчына Войстамскай парафіі каля Вілейкі (цяпер Смаргонскі раён). Яго бацькі, Ян і Караліна Ляшчэвічы, акрамя старэйшага Антонія мелі яшчэ трох сыноў – Вінцука, Пётру і Янку. Сям'я была вельмі пабожнай, але беднай, таму годную адукацыю сваім дзецям дазволіць не магла. Дапамог бяздзетны брат бацькі, які аплаціў адукацыю Антонія, Вінцэнта і Пятра.

Пачатковую трохгадовую адукацыю разам з братам Вінцэнтам Антоній атрымаў у Войстамскай школе. Пасля абодва хлопцы працягвалі навучанне ў гімназіі святой Кацярыны ў Санкт-Пецярбургу. Браты жылі ў свайго дзядзькі Юрыя Ляшчэвіча.

З 1908 г. Каталіцкую гімназію часта наведваў прафесар айцец Юрый Матулевіч, які прыходзіў сюды спавядаць вучняў і прамаўляў для іх казанні. Менавіта 1908 г. быў пачаткам вялікай рэформы Кангрэгацыі марыянаў, якую таемна праводзіў айцец Матулевіч. Таксама значны ўплыў на маладога Антонія аказаў прафесар Святога Пісання ксёндз Зігмунд Лазінскі, які пазней стаў Мінскім, а затым Пінскім біскупам.

У 1914 г. А. Ляшчэвіч стаў святаром (яму было на той момант 24 гады) і выехаў на Далёкі Усход, адкуль вярнуўся толькі праз 25 гадоў. У першы год сваёй святарскай дзейнасці айцец Антоній служыў вікарыем у Іркуцку. У 1915 г. выехаў у Чыту, дзе быў не толькі вікарыем, але і настаўнікам, а таксама прэфектам адразу ў трох школах. Праз два гады ксёндз Антоній атрымаў накіраванне ў Харбін, дзе прабыў ажно 12 гадоў. Спачатку малады святар працаваў настаўнікам лацінскай мовы і рэлігіі ў філіяльных харбінскіх школах і ў польскай гімназіі імя Генрыка Сянкевіча.


*Антоній Ляшчэвіч*

У 1924 г. Уладзівастоцкі біскуп Карл Slівоўскі ўтварыў новую парафію святога Язафата Кунцэвіча і даверыў яе айцу Антонію Ляшчэвічу. Ксёндз адразу пасля прызначэння распачаў будоўлю храма: 15 чэрвеня 1925 г. збудаваны з кедру храм быў асвечаны. Як толькі каля новага касцёла ўзвялі дом для святара, айцец Антоній арганізаваў у ім школу для бедных дзяцей.

У красавіку 1937 г. айцец Ляшчэвіч звярнуўся да прымаса Аўгуста Хлонда па дазвол на ўступленне ў законную супольнасць айцоў-марыянаў. У прашэнні ён выразна зазначыў, што вельмі хацеў бы адбыць навіцыят у Друйскім кляштары. Ксёндз Ляшчэвіч прыехаў у Друю ўвесну 1938 г.

Прадчуваючы рэальную пагрозу палітычных рэпрэсій над беларускімі святарамі, айцец Антоній выехаў у марыянскі законны дом у Вільні, дзе сустрэўся з генералам ордэна марыянаў айцом Цікотам, які параіў новаму кандыдату адбыць навіцыят у Скурцы, што каля Седльцаў у Польшчы. Прабыўшы ў Скурцы яшчэ два месяцы, ксёндз Ляшчэвіч, ужо як марыянін, рушыў у Друю.

У другой палове верасня Друю занялі савецкія войскі, адразу канфіскаваўшы ў кляштара жывёлу, збожжа і працоўны інвентар. У снежні савецкая ўлада закрыла друйскую гімназію. Вясною 1940 г. марыянскі кляштар пазбавілі права на зямельную ўласнасць, аднак марыяне і сёстры-еўхарысткі пакуль заставаліся ў сваіх законных дамах.

У верасні 1941 г. чатыры сястры з Друйскага кляштара выправіліся за былую савецка-польскую мяжу. У тую ж восень пытанне аб місіях ва Усходняй Беларусі было ўзгоднена з тагачасным Віленскім арцыбіскупам Рамуальдам Ялбжыкоўскім, які і дабраславіў марыянаў і сясцёр-еўхарыстак на працу. Першая імша ў Росіцы пасля доўгага перапынку адбылася яшчэ да прыезду туды місіянераў з Друі. У пачатку вайны нейкі час там працаваў ксёндз Гайлевіч. У лістападзе туды прыехаў з сёстрамі-еўхарысткамі айцец Ляшчэвіч.

На момант прыезду айца Антонія ў Росіцу з мясцовага неараманскага касцёла ўжо зрабілі вясковы клуб, вежы храма знеслі, а званы аддалі калгасу. Таксама была спустошана і праваслаўная царква.

Паступова да ксяндза Ляшчэвіча далучыліся іншыя марыяне: Фелікс Чачот, Уладзіслаў Лашэўскі і Генрых Тамашэўскі. З роднага Друйскага кляштара сясцёр-еўхарыстак на місіі таксама выехалі сёстры Ядвіга Віршута, К. Угарэнка, Р. Марцілёнак, А. Прытыцкая, Лоўкіс, Э. Варонька, Е. Трубіла, А. Мароз, П. Латышкевіч, А. Пяткун, М. Ясінская і інш.

Акрамя Росіцы, місіянеры працавалі ў вёсках Зашчырын, Замошша, Асвея, Баліны і іншых, аднак менавіта Росіца была асноўным пунктам. Матэрыяльна росіцкія місіі падтрымлівалі друйскія законнікі: тагачасны аканом Друйскага кляштара брат Люцыян Паўлік узяў на сябе клопат пра рэгулярнае харчовае і матэрыяльнае забеспячэнне Росіцы.

У чэрвені 1942 г. у росіцкай місіі адбыліся змены: айцец Чачот, які датуль займаўся рамонтам касцёла ў Росіцы і дапамагаў у душпастырскай працы айцу Ляшчэвічу, вярнуўся ў Друю, а ў Росіцу замест яго прыехаў айцец Юрый Кашыра.

У 1943 г. у сувязі з павышанай актыўнасцю партызанаў у Друі з'явілася карная экспедыцыя, заняўшы верхні паверх кляштара. Неўзабаве экспедыцыя накіравалася ў Росіцу. 16 лютага ў вёсцы пачалі біць званы: карнікі зганялі ў касцёл жыхароў, а таксама сясцёр-еўхарыстак. Многія людзі паспелі збегчы з вёскі, але тых, каго лавілі, зганялі ў розныя памяшканні, замыкалі, абкідвалі гранатамі і падпальвалі. У адрозненне ад вясковых жыхароў, святары А. Ляшчэвіч і Ю. Кашыра мелі права свабодна ўваходзіць у касцёл і пакідаць яго, а таксама ў любы момант пакінуць Росіцу. Святары, аднак, засталіся і выконвалі свае абавязкі: адпраўлялі імшу, спавядалі, хрысцілі, дабраслаўлялі, суцяшалі тых, хто быў у роспачы, прыносілі дзецям хлеб. Ім дапамагалі сёстры-еўхарысткі. Карнікі заявілі людзям, што іх вывезуць у лагеры, а дамы ў вёсцы паляць для таго, каб іх не змаглі заняць партызаны.

17 лютага салдаты пачалі дзяліць людзей у касцёле на групы: на адзін бок храма – для адпраўкі ў лагер, на другі – тых, якія павінны былі пайсці ў агонь. Сведкі адзначаюць, што немцы паводзілі сябе больш гуманна за паліцаяў. Святары не ўваходзілі ў гэтыя групы, ім дазвалялася пакінуць касцёл і вёску ў любы момант. Апоўдні групы людзей з касцёла пачалі вывозіць партыямі нібыта ў лагер, аднак жыхары бачылі, што везлі іх не ў кірунку чыгуначнай станцыі, а ў іншы бок. Падводы хутка вярталіся пустыя, а праз некалькі хвілінаў дамы пачалі гарэць і пачуліся асобныя стрэлы. Паводле словаў падвозчыкаў і тых нямногіх, каму ўдалося збегчы, людзей замыкалі ў будынках, падпальвалі, уцекачоў расстрэльвалі або зноў кідалі ў агонь, а дзяцей наколвалі на штыкі.

У той жа дзень па абедзе айцец Ляшчэвіч развітаўся з жыхарамі вёскі і сказаў, што яго выклікаюць паказаць склад, хаця ўсім было вядома, што ніякага склада ў Росіцы няма. Разам з групаю людзей ксёндз Ляшчэвіч быў спалены ў хляве 17 лютага 1943 г.

У 1999 г. сто восем каталіцкіх святароў з Беларусі звярнуліся да Папы Рымскага Яна Паўла II з прашэннем беатыфікаваць святароў Антонія Ляшчэвіча і Юрыя Кашыру, прылічыўшы пакутнікаў да ліку блажэнных. Беатыфікацыя беларускіх мучанікаў адбылася ў Варшаве 13 чэрвеня 1999 г. пад час наведвання Папам Янам Паўлам II Польшчы.

Адным з гэтых беларускіх просьбітаў да Папы быў айцец Леон, ксёндз з Войстама, у парафію якога ўваходзіла Абрамаўшчына. З яго ініцыятывы ў Абрамаўшчыне на месцы, дзе стаяла хата сям'і Ляшчэвічаў, быў усталяваны крыж. Штогод у дзень беатыфікацыі айца Ляшчэвіча на гэтым месцы праводзіцца свята вёскі.

У Росіцу рэгулярна арганізоўваюцца рэлігійныя пілігрымкі, ие таксама наведваюць і простыя турысты.



*Ікона блаславёных Антонія Ляшчэвіча і Юрыя Кашыры ў касцёле Найсвяцейшай Тройцы ў Росіцы*



*Помнік ахвярам нацыстаў у Росіцы*

*Падрыхтаваў Алесь САЧАНКА*

## Кастрычнік

**7 – Агінскі Міхал Клеафас** (1765 – 1833), дзяржаўны і ваенны (вялікі мечнік літоўскі, вялікі падскарбі літоўскі), дзеяч Рэчы Паспалітай, дыпламат, кампазітар, літаратар, удзельнік паўстання пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі – 255 гадоў з дня нараджэння.

**8 – Булатовіч Аляксандр Ксавер'евіч** (у манастве **Антоній**; 1870, Гродзенская губ. (?) – 1919), падарожнік, дыпламат, рэлігійны публіцыст, які доўгі час працаваў у Эфіопіі, правадзейны член Рускага геаграфічнага таварыства – 150 гадоў з дня нараджэння.

**8 – Калінкавічы** (1560), горад, цэнтр раёна Гомельскай вобласці – 460 гадоў з часу першага ўпамінання ў гістарычных крыніцах.

**10 – Жыткавічы** (1500), горад, цэнтр раёна Гомельскай вобласці – 520 гадоў з часу першага ўпамінання ў пісьмовых крыніцах.

**13 – Міхайлаў Павел Аляксандравіч** (1950, Кобрынскі р-н), лінгвіст, педагог, выдатнік адукацыі Беларусі – 70 гадоў з дня нараджэння.

**13 – Шнэйдар Анатоль Антонавіч** (1930, Талачынскі р-н), кінадакументаліст, краязнаўца, журналіст, культуролаг, гістарыёграф, публіцыст, лаўрэат і дыпламант многіх рэспубліканскіх і ўсесаюзных кінафестываляў – 90 гадоў з дня нараджэння.

**14 – Іваноў Леанід Леанідавіч** (1940, Магілёў – 2009), дырыжор, педагог, народны артыст Беларусі, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, заслужаны настаўнік Беларусі, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2003) – 80 гадоў з дня нараджэння.

**15 – Кашапараў Анатоль Яфімавіч** (1950, Мінск), спявак, удзельнік легендарнага ВІА «Песняры», заслужаны артыст Беларусі – 70 гадоў з дня нараджэння.

**15 – Сівакова Алена Аляксееўна** (1950, Гродна), спецыяліст у галіне бібліятэчнай справы, заслужаны дзеяч культуры Беларусі – 70 гадоў з дня нараджэння.

**16 – Падкавыраў Пётр Пятровіч** (1910 – 1977), кампазітар, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі – 110 гадоў з дня нараджэння.

**16 – Шатэрнік Аляксандр Сяргеевіч** (1940), мастак, аўтар твораў у манументальна-дэкаратыўнай, станковай і мемарыяльнай скульптуры, жывапісе – 80 гадоў з дня нараджэння.

**19 – Палуян Сяргей Епіфанавіч** (1890, Брагін – 1910), пісьменнік, літаратуразнаўца, публіцыст, адзін з пачынальнікаў беларускай прафесійнай літаратурнай крытыкі – 130 гадоў з дня нараджэння.

**20 – Шуманскі Міхаіл Рыгоравіч** (1920, Мёрскі р-н – 1982), спявак, заслужаны артыст Беларусі – 100 гадоў з дня нараджэння.

**21 – Фяцісаў Іван Якаўлевіч** (1920 – 1994), жывапісец, заслужаны дзеяч культуры Беларусі – 100 гадоў з дня нараджэння.

**24 – Арганізацыя Аб'яднаных Нацый** (1945), міжнародная арганізацыя, створаная для падтрымання міру, бяспекі і развіцця супрацоўніцтва паміж усімі краінамі – 75 гадоў з дня ўтварэння.

**24 – Радзевіч Тамара Канстанцінаўна** (1940), спецыяліст у галіне бібліятэчнай справы, уладальніца Ганаровага знака Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь – 80 гадоў з дня нараджэння.

**25 – Дударэнка Леанід Аляксандравіч** (1930, Маладзечна), жывапісец, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2000), узнагароджаны ордэнам Ф. Скарыны – 90 гадоў з дня нараджэння.

**26 – Дмахоўскі Генрык Міхайлавіч** (1810, Вільня ці Мёрскі р-н – 1863), скульптар, удзельнік рэвалюцыйнага руху ў Беларусі, Літве і Польшчы ў 1830 – 1860-я гг. – 210 гадоў з дня нараджэння.

**26 – Карбышаў Дзмітрый Міхайлавіч** (1880 – 1945), ваенны інжынер, генерал-лейтэнант інжынерных войск, які кіраваў рэканструкцыяй Брэсцкай крэпасці ў 1911 – 1914 гг., удзельнік руска-японскай 1904 – 1905 гг., Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў, абароны Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза (1946), кавалер ордэна Леніна – 140 гадоў з дня нараджэння.

**26 – Сярова Ірына Іванаўна** (1930 – 2001), вучоны-філосаф, заслужаны работнік вышэйшай школы Беларусі – 90 гадоў з дня нараджэння.

**28 – Урублеўскі Зыгмунт Фларэнты** (1845, Гродна – 1888), вучоны-фізік, педагог, адзін з заснавальнікаў фізікі нізкіх тэмператураў, член-карэспандэнт АН у Кракаве (Польшча), удзельнік паўстання 1863 – 1864 гг. – 175 гадоў з дня нараджэння.

**30 – Барысава (па мужу Мудрогіна) Тамара Цімафееўна** (1920 – 2000), вучоны-тэатразнаўца, крытык, педагог – 100 гадоў з дня нараджэння.

**31 – Гумілеўскі Леў Мікалаевіч** (1930), скульптар, народны мастак Беларусі, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1974), прэміі Саюзнай дзяржавы (2010) – 90 гадоў з дня нараджэння.

**31 – Пякуцька Альбіна Васільеўна** (1940), музычны дзеяч, харавы дырыжор, заслужаны работнік адукацыі Беларусі – 80 гадоў з дня нараджэння.

## Як па Прыпяці-рацэ…

**Уздоўж**

**1**. Тое, што і стос. **8**. Партовы параход (цеплаход), які буксіруе грузавыя судны. **9**. Таму, хто рана ўстае, … сама ў рукі ідзе (прык.). **10**. Таго не знаюць, дзе … зімуюць (прык.). **12**. «Шэпча хвалямі ціха гуллівымі – // … – прыгожая Прыпяць». З верша М. Чарота «Прыпяць». **15**. Задавальненне. **16**. Старажытны горад, прыстань на Прыпяці: «А на світанні ў задуменны … // Плыве павольна белы параход». З верша С. Грахоўскага «Палескія рэкі». **17**. Назва буйнога рачнога порта на Прыпяці, што знаходзіцца ў Мазыры. **18**. Тое, што ўтрымлівае судна, бакен на месцы. **19**. Ручай поіць раку, рака поіць … (прык.). **20**. Рака, правы прыток Прыпяці. **21**. «… крыштальным аж ірдзее, // Прыпяць жмурыцца ў агні». З верша Н. Аксёнчык «Белалозы». **23**. «… – пуць»; згодна з адной з версіяў, ад гэтага словазлучэння атрымала Прыпяць сваю назву. **24**. Плывучая землечарпальная машына. **27**. «… сена скубе на паромах-няўклюдах, // Перад бураю Прыпяць наморшчыла твар». З верша У. Верамейчыка «Прыпяць». 29. Маленькая газоўка. 32. Аркан. **33**. Інертны газ. **34**. … – макушка лета (прык.). **35**. Тое, што і схіл.

**Упоперак**

**2**. Левы прыток Прыпяці. **3**. Спецыяльны груз, які забяспечвае ўстойлівасць і асадку судна. **4**. Роўная прастора ўздоўж рачнога ложа Прыпяці ці іншай ракі. **5**. «У Прыпяць увесь … паплыў // Завулкамі, як рукавамі». З верша «Дождж у Мазыры» У. Дубоўкі. **6**. Зязюля прыносіць вестачку пра лета, а … – цёплыя дні (прык.). **7**. «…-Прыпяць пеніцца // У прадчуванні дня». З верша Г. Дашкевіч «Песня раніцы». **11**. Рыбалоўная снасць. **13**. Часовая плаціна, гаць. **14**. Аматарка чаго-небудзь (разм.). **20**. Вузкі, хуткі паток; такая назва Прыпяці існавала ў жыхароў Пінска і наваколля. **22**. Старажытнагрэчаскі гісторык, імя якога насіла мора, што некалі існавала на месцы Прыпяцкай нізіны. **25**. Тое, што і паводка. **26**. Хвалебны выгук у малітве (састар.). **28**. …! Векліч з пераможнай інтанацыяй. **30**. Спосаб хады, бегу каня. **31**. «А Прыпяць – // і неба, // і зоры калыша» . З верша У. Дубоўкі «… на Прыпяці і казка празоркі».



*Склаў Лявон ЦЕЛЕШ*

**Шаноўныя чытачы, падпісчыкі!**

**Наступны нумар «Краязнаўчай газеты» ў сувязі з неспрыяльнай эпідэміялагічнай сітуацыяй у краіне выйдзе *24 кастрычніка.* Беражыце сябе і родных! Будзем разам і надалей! Не забывайцеся таксама, што ідзе падпіска на 1-е паўгоддзе 2021 года.**

### Народ сказаў...

Вельмі хацелася жулікаватаму цыгану мець за кума пасечніка Хаму. Прыстаў як смала, што Хама не мог адмовіцца.

Не паспеў Хама стаць хросным, як да яго ўжо бяжыць кум.

– Кумок, каб ты ведаў, – кажа цыган, – як твой хрэснік расце. Ужо зусім выразна крычыць – мё-мё-мё. Мы яму малака, соску, таго-сяго, а ён сваё – мё-мё-мё. «Можа мёду?» – пытаю ў яго. Ён усміхаецца і маркоча – мё-мё-мё.

Напоўніў Хама слоік мёдам. Назаўтра кум зноў на парозе. Хоць і шкада было, але Хама зноў паслаў хрэсніку пачастунак. Калі праз дзень кум прывалокся на пасеку, то Хама яму так сказаў:

– Няма ў мяне часу з табой важдацца. Вунь на ліпе, бачыш, вулей. Лезь і бяры мёд сам.

Спрытна па лесвіцы ўскочыў на дрэва цыган. Тым часам Хама прыняў лесвіцу. Толькі крануў цыган вулей, як яго абсыпалі пчолы. Ён пачаў кідацца на дрэве, рынуўся ўніз, а лесвіцы няма. Скочыць баіцца, бо высока. Крычыць на чым свет стаіць. Прыбег Хама і пытае:

– Чаго табе?

У цыгана і з галавы выскачыла, як завецца лесвіца. Ён толькі мычыць, ды рукой торкае ўніз. Хама падае яму то сякеру, то вядро, то рыдлёўку. Раней, чым Хама «здагадаўся» падаць лесвіцу, кум грымнуўся ўніз, падхапіўся і задаў лататы.

Больш яго сын не прасіў мёду.

*– Вы нібыта казалі пра мяне, што я асёл. Ці гэта праўда?*

*– Гэта праўда, але я асабіста не казаў гэтага.*

*Паводле зборніка «Беларускія народныя жарты» (сабраў Змітро Бяспалы; Мінск, 1970)*

# Малая краязнаўчая энцыклапедыя

***(Пачатак у № 1 за 2003 год)***

**ПРУЖА́НЫ** *(заканчэнне артыкула).* У 2-й палове XVIII – XIX ст. існаваў Пружанскі жылы дом. Пабудаваны з дрэва ў стылі барока як гарадскі асабняк. Прамавугольны ў плане 1-павярховы (з мезанінам у цэнтры) будынак на цагляным падмурку, завершаны высокім ламаным дахам. Мезанін, завершаны на галоўным фасадзе трохвугольным франтонам, выступаў за аб'ём будынка і падтрымліваўся 4-а калонамі, што ўтваралі перад уваходам ґанак. Планіроўка



анфіладная. У цэнтры прыхожая і зала з гранёным эркерам на дваровым фасадзе, абапал іх размяшчаліся 4 жылыя пакоі.



Пружанскі жылы дом (чарцёж)

Пружанская гарадская сядзіба – помнік сядзібна-паркавай архітэктуры 2-й паловы XIX ст. Пабудаваная на паўднёвай ускраіне горада паводле праекта архітэктара Ланці. Ансамбль уключае мураваны сядзібны дом, да якога з боку горада вядзе шырокая алея, 2 мураваныя флігелі па баках ад яго і парк пейзажнага тыпу. Кампазіцыя сядзібнага дома складаецца з 2-х груп рознавялікіх аб'ёмаў, аб'яднаных 1-павярховым корпусам. Усе аб'ёмы маюць пакатыя дахі. З боку паўночнага фасада, арыентаванага на парк, вялікая тэраса з перакрыццём на 2-х калонках. Планіроўка анфіладная. Інтэр'ер аздоблены ляпнымі прафіляванымі карнізамі, камінамі і інш.

У 1852 г. у прадмесці Горкі пабудаваная капліца, у 1866 г. у цэнтры Пружанаў – Пружанскі сабор Аляксандра Неўскага, у 1875 – 1878 гг. – Спаса-Праабражэнская царква.

Пружанскі сабор Аляксандра Неўскага, помнік архітэктуры 2-й паловы XIX ст. пабудаваны ў 1806 г. Мае рысы стылю позняга класіцызму. Прамавугольная ў плане мураваная 3-нефавая 8-слуповая базіліка з паўавальнай 3-яруснай апсідай, завершанай купалам.

Пружанскія гандлёвыя рады – помнік грамадзянскай архітэктуры канца XIX ст. Пабудаваныя ў 1896 г., маюць рысы барока і класіцызму. Мураванае прамавугольнае ў плане збудаванне накрытае 2-схільным дахам. Падоўжныя фасады вырашаны ў выглядзе арачных галерэяў. Пралётам аркады адпавядаюць прамавугольныя нішы з праёмамі ў падоўжных сценах. Колішні праезд пасярэдзіне падкрэслены 3-пралётнымі рызалітамі, апрацаванымі пілястрамі і завершанымі фігурнымі франтонамі. Выкарыстоўваюцца як гандлёвае прадпрыемства.

У 1897 г. у Пружанах 7633 жыхары (43,4 % пісьменных), 14 дробных прадпрыемстваў, павятовае і 2-класнае прыходскае вучылішчы. У XIX – 1-й палове XX ст. Пружаны вядомыя як цэнтр ганчарнага рамяства (гл. Пружанская кераміка).

З 1921 г. у складзе Польскай дзяржавы, цэнтр павета. З 1939 г. у БССР, з 15.01.1940 г. цэнтр раёна. У Вялікую Айчынную вайну з 23.06.1941 да 17.07.1944 г. акупаваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі, якія тут загубілі ў лагеры смерці больш за 4 тыс. чалавек, знішчылі 70 % жылога фонду.

У сучасным горадзе тры планіровачныя раёны: паўднёвы, заходні і ўсходні.

На вул. Савецкай створаная плошча (гістарычны цэнтр горада). Захаваліся помнікі архітэктуры XIX ст.: Пружанскія гандлёвыя рады, Пружанская гарадская сядзіба. Усталяваныя помнікі лётчыку С. Гудзімаву, на брацкай магіле чырвонаармейцаў, якія загінулі ў 1920 г., савецкім лётчыкам, на брацкай магіле 250-і савецкіх воінаў і партызанаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ды інш.



Пружанская гарадская сядзіба (фота 1915 – 1918 гадоў)



Пружанскі сабор Аляксандра Неўскага

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 08 мая 2014 г. Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры»; Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.
Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.
Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Навум Гальпяровіч, Вітольд Ермалёнак, Алесь Карлюкевіч, Людміла Кірухіна, Адам Мальдзіс, Сяргей Мітраховіч, Вячаслаў Рагойша, Павел Сапоцька, Віктар Скорабагатаў, Тадэуш Стружэцкі.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Траецкая набярэжная, 6. Тэл. 283-28-26. Тэл./факс 334-42-03 E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас. Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. Пры перадруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 08.10.2020
Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14). Ліцэнзія ЛП № 02330/85 ад 29.03.2004.
Заказ 481. Тыраж 390 асобнікаў.